Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Витебский государственный
университет имени П.М. Машерова»
Кафедра социально-педагогической работы

# ФОРМИРОВАНИЕ НАЦИОНАЛЬНОГО САМОСОЗНАНИЯ СТУДЕНТОВ: ПРОГРАММЫ, АНТОЛОГИЯ

***Методические рекомендации***

*Витебск*
*ВГУ имени П.М. Машерова*
*2025*

УДК 37.015.31:172.15:159.923.2-057.875(075.8)
ББК 74.005.24я73+88.542.5я73+74.480.0я73
Ф79

Печатается по решению научно-методического совета учреждения образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова». Протокол № 3 от 26.02.2025.

Составители: заведующий кафедрой социально-педагогической работы ВГУ имени П.М. Машерова, кандидат педагогических наук, доцент **Е.Л. Михайлова;** доцент кафедры социально-педагогической работы ВГУ имени П.М. Машерова, кандидат педагогических наук, доцент **Н.Ю. Андрущенко;** старший преподаватель кафедры социально-педагогической работы ВГУ имени П.М. Машерова **Л.В. Королькова**

Р е ц е н з е н т :
заведующий кафедрой инклюзивного образования
ВГУ имени П.М. Машерова, кандидат педагогических наук, доцент
*Н.И. Бумаженко*

**Ф79** **Формирование национального самосознания студентов: программы, антология :** методические рекомендации / сост.: Е.Л. Михайлова, Н.Ю. Андрущенко, Л.В. Королькова. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2025. – 56 с.

Издание включает методические материалы (разработанные программы, высказывания известных белорусских и зарубежных мыслителей, антологию, пословицы и поговорки, описание праздников), которые можно применять на учебных занятиях и во внеучебной деятельности.

Рекомендовано для преподавателей, обеспечивающих учебный процесс и организующих воспитательную работу со студентами, обучающимися, а также для педагогов учреждений образования и дополнительного образования, студентов.

**УДК 37.015.31:172.15:159.923.2-057.875(075.8)**
**ББК 74.005.24я73+88.542.5я73+74.480.0я73**

© ВГУ имени П.М. Машерова, 2025

# СОДЕРЖАНИЕ

**ВВЕДЕНИЕ** ........................................................................ 4
**ПРОГРАММЫ** ........................................................................ 5
**Праграма вучэбнага факультатыва “Культура Беларусі”** .......... 5
Метадычныя рэкамендацыі да праграмы ........................................ 11
Раздзел “Беларускі дзіцячы фальклор” ........................................... 11
Раздзел “Гульнявыя дзіцячыя святы і абрады беларускага народнага календара” ........................................................................ 15
Раздзел “Святы і святочныя дні” .................................................... 16
Раздзел “Народная творчасць” ....................................................... 17
Раздзел “Традыцыйныя народныя веды беларусаў” ...................... 19
Раздзел “Беларускае традыцыйнае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” ............................................................... 20
Раздзел “Беларускія народныя каляндарна-земляробчыя святы і абрады” ........................................................................ 23
Раздзел “Народная сямейна-традыцыйная абраднасць беларусаў” 29
**Педагагічная праграма “Урокі фальклора”** ................................. 32
**МИНИ-АНТОЛОГИЯ** ........................................................................ 39
Конфуций. *Беседы и суждения* ..................................................... 42
Владимир Мономах. *Поучение* ...................................................... 42
Ян Лициний Намысловский. *Избранные «Сентенции»* ............... 44
Константин Дмитриевич Ушинский. *Глава VIII. Воспитание и характер. Какую роль играет народность в воспитании?* ....... 46
М.І. Касьпяровіч. *Асьветнае краязнаўства* .................................. 50
К. Шапялевіч. *Організацыя і змест працы школьна-краязнаўчых гурткоў* ........................................................................ 51
Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі .................................. 51
Беларускія народныя святы і абрады ........................................... 53

# ВВЕДЕНИЕ

«Формирование национального самосознания студентов: программы, антология», в первую очередь предназначено для эффективной организации воспитательной работы в условиях учреждения образования.

Издание включает методические материалы (разработанные программы, высказывания известных белорусских и зарубежных мыслителей, антологию, пословицы и поговорки, описания праздников), которые можно применять на учебных занятиях и во внеучебной деятельности.

Программа «Культура Беларусі», рассчитанная на обучающихся со 2 по 11 класс, охватывает годовой народный земледельческий и семейный календарь праздников и обрядов белорусов, в том числе значимые для народа этнокультурные, этнопедагогические аспекты. Программа «Урокі фальклора» направлена на работу созданного детского фольклорного коллектива для наиболее полного и всестороннего развития личности, раскрытия творческих способностей каждого ребенка, формирования интереса к родному языку, любви к Родине, родной земле, а также для знакомства с обрядами, традициями и юмором белорусского народа.

Представленные программы были разработаны старшим преподавателем кафедры социально-педагогической работы Л.В. Корольковой.

Важным аспектом исторического педагогического образования является работа с первоисточниками. В данном издании размещены высказывания известных людей – ученых, просветителей, педагогов – для обсуждения и организации бесед, выдержки из трудов ученых по нравственному, патриотическому, трудовому воспитанию, а также белорусские народные пословицы и поговорки, праздники и обряды.

Антология и мини-антология разработаны доцентом кафедры социально-педагогической работы Н.Ю. Андрущенко. Этнокультурные материалы (пословицы и поговорки, праздники и обряды белорусов) и мини-антология (на белорусском языке) представлены заведующим кафедрой социально-педагогической работы Е.Л. Михайловой.

Рекомендовано для преподавателей, обеспечивающих учебный процесс и организующих воспитательную работу со студентами, обучающимися, а также для педагогов учреждений образования, педагогов дополнительного образования, студентов.

# ПРОГРАММЫ

Программы, созданные для организации воспитательной работы, содержат этнографические материалы, этнопедагогические идеи, устное народное творчество, связаны с белорусским календарем праздников и семейной обрядностью. Программы, разработанные для педагогов образовательных учреждений и педагогов дополнительного образования, могут вариативно использоваться для учреждений среднего специального и высшего образования.

## ПРАГРАМА ВУЧЭБНАГА ФАКУЛЬТАТЫВА “КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ”

### *Тлумачальная запіска*

У народзе кажуць: “Няма дрэва без каранёў, дому без фундамента”. Цяжка пабудаваць будучыню, не пазнаючы гістарычных каранёў. Са шкадаваннем даводзіцца прызнаць, што за апошні час цікавасць да звычаяў старадаўнасці не вельмі актыўная, асабліва ў моладзі, школьнікаў. А як бывала, весела праходзілі вячоркі, калядкі, талака, масленіца, вяселле… Колькі было паэзіі, народнага гумару, кемлівасці.

Ніводнае свята не абыходзілася без гармоніка, балалайкі, дудкі. Зараз сапраўды народныя музычныя інструменты на вуліцах, у народным асяроддзі амаль змоўклі.

Нярэдка даводзіцца чуць нараканні на тое, што ў сучасным жыцці, асабліва ў моладзі, усё меней ды меней месца застаецца для народнай песні, старажытнага абраду. Асноўнае месца займае сучасная музыка, песні без слоў і зместу.

Адным са шляхоў павышэння сацыяльна-культурнай актыўнасці людзей з’яўляецца далейшае развіццё і ўдасканаленне свят каляндарнага цыкла, вывучэнне гісторыі беларускай народнай культуры, што з’яўляецца найбольш эфектыўнымі формамі засваення культурнай спадчыны прадстаўнікамі розных катэгорый насельніцтва. Аднак, як сведчыць практыка, дзейнасць шматлікіх агульнаадукацыйных школ у гэтай сферы народнай творчасці знаходзіцца пакуль што ў нездавальняючым становішчы.

Так, вывучэнне каляндарных свят, іх агульных і спецыфічных рыс, узаемадзеяння традыцый і навацый мае практычную неабходнасць, з’яўляецца сацыяльна значным.

Факультатыўная дысцыпліна “Культура Беларусі” мае шырокае прызначэнне, паколькі распрацавана з тым улікам, каб быць актуальнай як для навучэнцаў агульнаадукацыйных школ, так і сярэдніх спецыяльных устаноў, а таксама студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі. Яго змест, прынцыпы пабудовы праграмы і метадычная сістэма выкладання маюць мэту выкарыстоўваць сілу ўздзеяння ўсіх напрамкаў народнай творчасці ў іх комплексе для фарміравання асобы школьніка, навучэнца, студэнта, маральна-псіхалагічных перакананняў.

Мэта факультатыўнай дысцыпліны – фарміраванне асобы праз народную творчасць. Праграма таксама накіравана на вывучэнне беларускай народнай культуры, праблем выкарыстання вольнага часу школьніка скрозь прызму фальклорна-этнічных працэсаў, раскрыццё шляхоў удасканалення сучасных каляндарных свят на аснове культурна-гістарычнай пераемнасці.

Праграма факультатыўнай дысцыпліны прадугледжвае наступныя задачы:

1. Авалоданне школьнікамі, навучэнцамі, студэнтамі ведамі аб этнічнай гісторыі і матэрыяльнай культуры беларусаў.

2. Знаёмства з духоўнай культурай і яе неад'емным элементам – святамі і абрадамі.

3. Раскрыццё генетычнай асновы і тэндэнцый развіцця каляндарных свят, іх этнічнай спецыфікі, агульнанацыянальных рыс і лакальных асаблівасцей.

4. Вызначэнне працэсаў пераемнасці, зменлівасці і ўстойлівасці каляндарнай абраднасці беларусаў.

5. Выяўленне асноўных прычын, якія перашкаджаюць распаўсюджванню народных традыцый, абазначэнне шляхоў павышэння выхаваўчага ўздзеяння свят каляндарнага цыкла і выпрацоўка практычных рэкамендацый па выкарыстанні лепшых элементаў беларускай абраднасці ў жыцці.

6. Фарміраванне творчай свядомасці школьнікаў.

Матэрыял у праграме змешчаны па прынцыпе ад простага да складанага.

Найбольш аптымальным спосабам адукацыі і выхавання школьнікаў, навучэнцаў, студэнтаў з'яўляецца прынцып міжпрадметных сувязей. Па гэтым прынцыпе пабудавана праграма. Яна ўлічвае змест такіх прадметаў / дысцыплін, як "Гісторыя Беларусі", "Культуралогія", "Музыка", "Сусветная мастацкая культура", "Літаратуразнаўства", "Выяўленчае мастацтва", "Рытміка", "Беларуская мова", "Беларуская літаратура", "Фізічнае выхаванне". Таму асобныя тэмы прадмета "Культура Беларусі" не прадугледжаны ў праграме або маюць аглядны характар, а за аснову факультатыўнай дысцыпліны ўзяты яго галоўны раздзел "Этнаграфія і фальклор Беларусі", які не вывучаецца іншымі прадметамі. Выкарыстанне фальклору дапамагае станоўчаму пераносу ведаў, якія школьнікі, навучэнцы, студэнты набылі на занятках па іншых прадметах, у новыя ўмовы, развівае іх мысленне.

Фальклор як сінкрэтычная творчасць якраз і адпавядае дзіцячаму светаўспрыманню рэчаіснасці. Таму нельга недаацэньваць народную традыцыйную творчасць у комплексным выхаванні, адукацыі, асабліва малодшых школьнікаў, якія спрыяюць больш высокаму творчаму ўзросту засваення разнастайных ведаў. Факультатыўная дысцыпліна таму можа вывучацца нават дзецьмі малодшага школьнага ўзросту (другія класы).

Праграма "Культура Беларусі" пабудавана ў двух напрамках: тэарэтычная падрыхтоўка і набыццё школьнікамі, навучэнцамі, студэнтамі практычных ведаў і ўменняў праз удзел у школьным / студэнцкім фальклорным гуртку "Спадчына", грамадскіх арганізацыях "Нашчадкі", "Сузор'е", школьных раённых і гарадскіх фальклорных фестывалях, мерапрыемствах, аглядах і конкурсах. Формай асваення і кантролю ведаў з'яўляюцца самастойныя распрацоўкі асобных тэм праграмы школьнікамі, навучэнцамі, студэнтамі, падрыхтоўка рэфератаў і паведамленняў, удзел у агульнашкольных канферэнцыях у якасці дакладчыкаў.

Праграма разлічана на 340 гадзін з ліку школьнага кампанента. Праводзіцца 1 раз на тыдзень у аб'ёме 1 гадзіна.

Факультатыўная дысцыпліна (раздзел "Этнаграфія і фальклор Беларусі") можа быць спецыялізаванай вучэбнай дысцыплінай установы адукацыі, якая мае культуралагічны або этнапедагагічны накірунак адукацыі і выхавання школьнікаў, навучэнцаў, студэнтаў. Праграма ўключае наступныя раздзелы: "Беларускі дзіцячы фальклор", "Гульнявыя дзіцячыя святы і абрады беларускага народнага календара", "Святы і святочныя дні", "Народная творчасць", "Традыцыйныя народныя веды беларусаў", "Беларускае традыцыйнае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва", "Беларускія народныя каляндарна-земляробчыя святы і абрады", "Народная сямейна-традыцыйная абраднасць беларусаў".

Для больш глыбокага засваення матэрыялу павінны выкарыстоўвацца розныя віды заняткаў: заняткі-гульні, заняткі-дыспуты, заняткі-экскурсіі, тэатралізаваныя, камбінаваныя, падагульняючыя, аукцыёны ведаў, конкурсы і фальклорныя віктарыны, пазнавальна-забаўляльныя праграмы.

Акрамя заняткаў праграма прадугледжвае наведванне музеяў, выстаў народнай творчасці, культурна-асветных устаноў, сустрэчы з народнымі майстрамі, этнографамі, фалькларыстамі, дзеячамі культуры, прагляд і аналіз выступленняў фальклорных калектываў, праграм фестываляў народнай творчасці, сямейных абрадаў, свят народных рамёстваў, выраб па традыцыйных рэцэптах беларускіх абрадавых страў і напояў.

Шырокая палітра тэм, што ўваходзяць у раздзелы праграмы, дае ўяўленне аб незвычайным багацці беларускага фальклору, народнай творчасці, спрыяе развіццю разнастайных творчых заняткаў і здольнасцей школьнікаў, навучэнцаў, студэнтаў.

Прадстаўленая праграма можа быць перапрацавана для устаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі (з варыяцыяй тэм, гадзін на вывучэнне).

***Прыкладны тэматычны план па вучэбным факультатыве “Культура Беларусі” (раздзел “Этнаграфія і фальклор Беларусі”) для ўстаноў адукацыі***

| *№ п/п* | *Назва раздзелу, тэм* | *Клас* | *Колькасць гадзін* |
|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* |
| РАЗДЗЕЛ 1. БЕЛАРУСКІ ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР | | | |
| 1.1 | ТЭМА 1. Уводзіны. Дзіцячы фальклор як від народнай творчасці | 2 | 1 |
| 1.2 | ТЭМА 2. Калыханкі | 2 | 3 |
| 1.3 | ТЭМА 3. Забаўлянкі | 2 | 3 |
| 1.4 | ТЭМА 4. Дражнілкі | 2 | 2 |
| 1.5 | ТЭМА 5. Лічылкі | 2 | 4 |
| 1.6 | ТЭМА 6. Заклічкі. Прыгаворы | 2 | 3 |
| 1.7 | ТЭМА 7. Беларускія дзіцячыя народныя гульні | 2 | 18 |
| | УСЯГО: | 2 клас | 34 гадзіны |
| 1.8 | ТЭМА 8. Фальклор для дзяцей – складаная сукупнасць жанраў | 3 | 1 |
| 1.9 | ТЭМА 9. Казкі | 3 | 4 |
| 1.10 | ТЭМА 10. Песні дзіцячага фальклору. Прыпеўкі | 3 | 3 |
| 1.11 | ТЭМА 11. Небыліцы | 3 | 3 |
| 1.12 | ТЭМА 12. Дакучкі | 3 | 3 |
| 1.13 | ТЭМА 13. Загадкі | 3 | 5 |
| 1.14 | ТЭМА 14. Беларускія народныя скарагаворкі | 3 | 3 |
| 1.15 | ТЭМА 15. Беларускія дзіцячыя народныя гульні | 3 | 12 |
| | УСЯГО: | 3 клас | 34 гадзіны |
| 1.16 | ТЭМА 16. Фальклор для дзяцей як адносна самастойная сістэма | 4 | 1 |
| 1.17 | ТЭМА 17. Прыказкі і прымаўкі | 4 | 4 |
| 1.18 | ТЭМА 18. Дзіцячыя анекдоты, жарты, досціпы | 4 | 5 |
| 1.19 | ТЭМА 19. Беларускія народныя прыкметы і павер’і | 4 | 4 |
| 1.20 | ТЭМА 20. Легенды і паданні | 4 | 4 |
| 1.21 | ТЭМА 21. Беларускія дзіцячыя народныя гульні для дзяцей | 4 | 16 |
| | УСЯГО: | 4 клас | 34 гадзіны |

| | | | |
|---|---|---|---|
| РАЗДЗЕЛ 2. ГУЛЬНЯВЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ СВЯТЫ І АБРАДЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА КАЛЕНДАРА | | | |
| 2.1 | ТЭМА 1. Дзіцячы гульнёвы фальклор свят і абрадаў каляндарнага цыкла: агульная характарыстыка | 5 | 1 |
| 2.2 | ТЭМА 2. Народны каляндар | 5 | 3 |
| 2.3 | ТЭМА 3. Народныя дзіцячыя гульні каляндарна-абрадавых свят зімы | 5 | 3 |
| 2.4 | ТЭМА 4. Гульнёвы дзіцячы фальклор каляндарна-абрадавых свят вясновага цыкла | 5 | 3 |
| 2.5 | ТЭМА 5. Народныя дзіцячыя гульні каляндарна-абрадавых свят лета | 5 | 3 |
| 2.6 | ТЭМА 6. Дзіцячыя гульні і забавы каляндарна-абрадавых свят восені | 5 | 2 |
| 2.7 | ТЭМА 7. Народная гульня як грамадская з’ява | 5 | 1 |
| | УСЯГО: | 5 клас | 16 гадзін |
| РАЗДЗЕЛ 3. СВЯТЫ І СВЯТОЧНЫЯ ДНІ | | | |
| 3.1 | ТЭМА 1. Агульная характарыстыка свят і святочных дзён на Беларусі | 5 | 2 |
| 3.2 | ТЭМА 2. Свята дома, двара | 5 | 2 |
| 3.3 | ТЭМА 3. Свята вуліцы | 5 | 2 |
| 3.4 | ТЭМА 4. Свята горада | 5 | 3 |
| 3.5 | ТЭМА 5. Свята вёскі | 5 | 2 |
| 3.6 | ТЭМА 6. Свята песні | 5 | 3 |
| 3.7 | ТЭМА 7. Свята першай баразны | 5 | 2 |
| 3.8 | ТЭМА 8. Свята ўраджаю | 5 | 2 |
| | УСЯГО: | 5 клас | 18 гадзін |
| РАЗДЗЕЛ 4. НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ | | | |
| 4.1 | ТЭМА 1. Уводзіны ў раздзел. Асноўныя формы і віды народнай творчасці беларусаў | 6 | 1 |
| 4.2 | ТЭМА 2. Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць | 6 | 2 |
| 4.3 | ТЭМА 3. Народныя беларускія гульні | 6 | 2 |
| 4.4 | ТЭМА 4. Беларускі народны танец | 6 | 2 |
| 4.5 | ТЭМА 5. Беларуская народная музычная творчасць | 6 | 2 |
| 4.6 | ТЭМА 6. Беларускі народны тэатр | 6 | 4 |
| 4.7 | ТЭМА 7. Беларусі кірмаш | 6 | 3 |
| | УСЯГО: | 6 клас | 16 гадзін |
| РАЗДЗЕЛ 5. ТРАДЫЦЫЙНЫЯ НАРОДНЫЯ ВЕДЫ БЕЛАРУСАЎ | | | |
| 5.1 | ТЭМА 1. Народная мараль | 6 | 2 |
| 5.2 | ТЭМА 2. Народны этыкет | 6 | 3 |
| 5.3 | ТЭМА 3. Народная педагогіка | 6 | 2 |
| 5.4 | ТЭМА 4. Народная медыцына | 6 | 2 |
| 5.5 | ТЭМА 5. Народная метэаралогія | 6 | 3 |
| 5.6 | ТЭМА 6. Міфалогія і міфалагічныя вобразы ў беларускім фальклоры | 6 | 3 |
| 5.7 | ТЭМА 7. Беларуская народная кухня | 6 | 3 |
| | УСЯГО: | 6 клас | 18 гадзін |

| | | | |
|---|---|---|---|
| РАЗДЗЕЛ 6. БЕЛАРУСКАЕ ТРАДЫЦЫЙНАЕ НАРОДНАЕ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА | | | |
| 6.1 | ТЭМА 1. Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: яго асаблівасці і характар | 7 | 2 |
| 6.2 | ТЭМА 2. Мастацкая апрацоўка дрэва | 7 | 2 |
| 6.3 | ТЭМА 3. Разьба па косці | 7 | 1 |
| 6.4 | ТЭМА 4. Ганчарства | 7 | 2 |
| 6.5 | ТЭМА 5. Саломапляценне | 7 | 3 |
| 6.6 | ТЭМА 6. Пляценне з лазы | 7 | 2 |
| 6.7 | ТЭМА 7. Выцінанка як від народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці | 7 | 1 |
| 6.8 | ТЭМА 8. Кавальства як від беларускага народнага рамяства | 7 | 1 |
| 6.9 | ТЭМА 9. Мастацкі роспіс | 7 | 2 |
| 6.10 | ТЭМА 10. Вырабы з цеста | 7 | 1 |
| 6.11 | ТЭМА 11. Ткацтва | 7 | 3 |
| 6.12 | ТЭМА 12. Вышыўка | 7 | 3 |
| 6.13 | ТЭМА 13. Беларускі ручнік | 7 | 2 |
| 6.14 | ТЭМА 14. Беларускі арнамент | 7 | 3 |
| 6.15 | ТЭМА 15. Беларускае народнае адзенне | 7 | 4 |
| 6.16 | ТЭМА 16. Стан сучаснай беларускай народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці | 7 | 2 |
| | УСЯГО: | 7 клас | 34 гадзіны |
| РАЗДЗЕЛ 7. БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЛЯНДАРНА-ЗЕМЛЯРОБЧЫЯ СВЯТЫ І АБРАДЫ | | | |
| 7.1 | ТЭМА 1. Уводзіны ў раздзел | 8 | 2 |
| *Падраздзел “Народныя каляндарна-абрадавыя святы зімы”* | | | |
| 7.2 | ТЭМА 2. Зімовы перыяд беларускага народнага земляробчага календара | 8 | 1 |
| 7.3 | ТЭМА 3. Зімовы Мікола | 8 | 1 |
| 7.4 | ТЭМА 4. Беларускі народны абрадава-святочны каляндарны цыкл | 8 | 5 |
| 7.5 | ТЭМА 5. Свята Грамніцы – Стрэчанне | 8 | 2 |
| 7.6 | ТЭМА 6. Масленіца | 8 | 4 |
| 7.7 | ТЭМА 7. Традыцыі і навацыі ў сучасных каляндарна-абрадавых святах зімовага перыяду | 8 | 2 |
| *Падраздзел “Народныя каляндарна-абрадавыя святы вясны”* | | | |
| 7.8 | ТЭМА 8. Веснавы перыяд беларускага народнага земляробчага календара: агульная характарыстыка | 8 | 1 |
| 7.9 | ТЭМА 9. Святы сустрэчы вясны | 8 | 2 |
| 7.10 | ТЭМА 10. Благавешчанне – старажытнае веснавое свята народнага календара | 8 | 1 |
| 7.11 | ТЭМА 11. Вялікдзень – славянскае свята абуджэння прыроды | 8 | 3 |
| 7.12 | ТЭМА 12. Радаўніца – дзень памінання продкаў | 8 | 1 |
| 7.13 | ТЭМА 13. Юр’я – старадаўняе земляробчае свята першага абрадавага выгану жывёлы ў поле | 8 | 2 |
| 7.14 | ТЭМА 14. Веснавы абрад “Страла” | 8 | 1 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 7.15 | ТЭМА 15. Мікола – старадаўняе каляндарна-абрадавае свята апекуна земляробства | 8 | 1 |
| 7.16 | ТЭМА 16. Абрады “Сёмуха” – русальнага цыкла | 8 | 3 |
| 7.17 | ТЭМА 17. Выкарыстанне народных традыцый у сучасных каляндарных святах веснавога цыкла | 8 | 2 |
| | УСЯГО: | 8 клас | 34 гадзіны |
| | *Падраздзел “Народныя каляндарна-абрадавыя святы летняга цыкла”* | | |
| 7.18 | ТЭМА 18. Летні перыяд земляробчага календара: агульная характарыстыка | 9 | 1 |
| 7.19 | ТЭМА 19. Касецкія абрады, традыцыі і звычаі беларусаў | 9 | 1 |
| 7.20 | ТЭМА 20. Купалле – свята ў гонар агню і сонца | 9 | 6 |
| 7.21 | ТЭМА 21. Пятро – старажытнае земляробчае свята культа зеляніны | 9 | 1 |
| 7.22 | ТЭМА 22. Ілля – распарадчык дажджоў і навальніц, апякун земляробства | 9 | 1 |
| 7.23 | ТЭМА 23. Жніўныя святы народнага календара | 9 | 4 |
| 7.24 | ТЭМА 24. Традыцыі і навацыі ў сучасных каляндарна-абрадавых святах жніва беларусаў | 9 | 1 |
| 7.25 | ТЭМА 25. Спасаўскія святкі | 9 | 1 |
| 7.26 | ТЭМА 26. Прачыстая – свята ўраджаю | 9 | 1 |
| | *Падраздзел “Асенні перыяд народнага земляробчага календара”* | | |
| 7.27 | ТЭМА 27. Асеннія святы ўсходніх славян, іх агульнаславянскія рысы і нацыянальныя асаблівасці ў беларусаў | 9 | 2 |
| 7.28 | ТЭМА 28. Багач – старажытнае свята заканчэння ўборкі збожжа | 9 | 2 |
| 7.29 | ТЭМА 29. Здзвіжанне – свята “закрывання” зямлі на зіму | 9 | 2 |
| 7.30 | ТЭМА 30. Абрад “Жаніцьба коміна” | 9 | 2 |
| 7.31 | ТЭМА 31. Пакровы – народнае земляробчае свята заканчэння ўсіх палявых работ | 9 | 2 |
| 7.32 | ТЭМА 32. Асяніны – дзень памінання продкаў, асеннія дзяды | 9 | 1 |
| 7.33 | ТЭМА 33. Піліпаўка | 9 | 2 |
| 7.34 | ТЭМА 34. Выкарыстанне народных традыцый у сучасных каляндарна-абрадавых святах восені | 9 | 2 |
| 7.35 | ТЭМА 35. Заключэнне па раздзелу | 9 | 2 |
| | УСЯГО: | 9 клас | 34 гадзіны |
| | РАЗДЗЕЛ 8. НАРОДНАЯ СЯМЕЙНА-ТРАДЫЦЫЙНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ | | |
| 8.1 | ТЭМА 1. Уводзіны ў раздзел | 10 | 3 |
| 8.2 | ТЭМА 2. Радзінная абраднасць | 10 | 21 |
| 8.3 | ТЭМА 3. Беларускае народнае вяселле | 10 | 10 |
| | | 11 | 16 |
| 8.4 | ТЭМА 4. Пахавальна-памінальная абраднасць | 11 | 10 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 8.5 | ТЭМА 5. Сучасныя беларускія традыцыі святкавання дзён нараджэнняў, юбілеяў і дзён імянінніка | 11 | 1 |
| 8.6 | ТЭМА 6. Праводзіны ў войска | 11 | 1 |
| 8.7 | ТЭМА 7. Уваходзіны (Наваселле) | 11 | 2 |
| 8.8 | ТЭМА 8. Новы год | 11 | 1 |
| 8.9 | ТЭМА 9. Народная талака | 11 | 1 |
| 8.10 | ТЭМА 10. Прастольныя святы | 11 | 1 |
| 8.11 | ТЭМА 11. Падагульняючы занятак па раздзелу, факультатыву | 11 | 1 |
| | УСЯГО: | 10–11 кл. | 68 гадзін |
| | УСЯГО ПА ФАКУЛЬТАТЫВЕ : | 2–11 кл. | 340 гадзін |

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ДА ПРАГРАМЫ

## РАЗДЗЕЛ “БЕЛАРУСКІ ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР”

### ТЭМА 1. УВОДЗІНЫ. ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР ЯК ВІД НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Асноўныя жанры фальклору для дзяцей і іх агульная характарыстыка. Незвычайнасць зместу дзіцячага фальклору, яго актыўныя дзеючыя вобразы.

### ТЭМА 2. КАЛЫХАНКІ

Калыханкі як адзін з самых старадаўніх відаў народнай творчасці. Галоўная функцыя калыханак – супакойванне дзіцяці, каб яно хутчэй засыпала. Калыханка як старажытны песенны жанр. Асаблівасці калыханак: адухоўленасць прыроды, звяры і жывёлы надзелены чалавечымі якасцямі, плаўнасць і спакойнасць мелодыі, рытм адпавядае рытму гушканняў калыскі. Сэнс калыханак – знаёміць дзіцяці з навакольным светам, расказваць пра хатніх жывёл, птушак, розных звяроў, іх прыгоды і ўчынкі. Асноўныя вобразы калыханак: кот, мышкі, курку, галубы, сарокі, зайчыкі, бычок.

### ТЭМА 3. ЗАБАЎЛЯНКІ

Забаўлянкі, пацешкі, забаўкі: іх характэрныя рысы і прызначэнне. Прызначэнне забаўлянак: суцяшаць просценькімі гульнямі, рассмяшыць дзіця, весяліць, узбуджаць, рабіць дзіця бадзёрым. Формы забаўлянак: вершаваныя шматрадкоўі з хуткім рытмам, прыгаворы, жартоўна-гумарыстычныя, вымаўляюцца ў рытме рухаў і поўных дзеянняў, імправізацыя. Асобныя групы забаўлянак: гушканне на назе дарослага, імітуючы язду на кані; забаўлянкі пры гульні з ножкамі, пальцамі і ручкамі дзіцяці; забаўлянкі, якія суправаджаюць казытанне, пагладжванне.

### ТЭМА 4. ДРАЖНІЛКІ

Дражнілкі – невялікія вершаваныя творы, у якіх высмейваецца “супраціўнік”. Накіраванасць сатыры дражнілак: на імя чалавека, нейкія своеасаблівыя якасці чалавека. Дражнілкі як сродак свайго роду самасцвярджэння.

### ТЭМА 5. ЛІЧЫЛКІ

Лічылкі як невялікія вершаваныя гумарыстычнага характару творы, з дапамогай якіх вызначаецца чарговасць у гульні, выбіраюцца вядучыя або дзеючыя асобы. Спецыфіка лічылак. Групы лічылак: сюжэтныя і бессюжэтныя. З гісторыі ўзнікнення лічылак і іх прызначэння. Сучасны час і яго ўплыў на змест лічылак.

ТЭМА 6. ЗАКЛІЧКІ. ПРЫГАВОРЫ

Заклічкі - кароткія прыгаворы, звернутыя да сонца, дажджу, насякомых, птушак, раслін. Вершаваныя прыгаворы і дзіцячыя дзеянні. Прыгаворы пры купанні, пры збіранні грыбоў, у час пасьбы жывёлы. Характэрныя рысы прыгавораў: багацейшая рыфма твораў, дакладны рытм.

ТЭМА 7. БЕЛАРУСКІЯ ДЗІЦЯЧЫЯ НАРОДНЫЯ ГУЛЬНІ

Гульня як адзін з асноўных жанраў дзіцячага фальклору, асноўная форма дзейнасці дзяцей, змест іх жыцця. Гульня і далучэнне дзяцей да радаснага знаёмства з навакольным светам. Развіццё творчых здольнасцей дзяцей, фантазіі, іх чалавечых якасцей праз гульню. Асноўныя задачы гульняў і іх напрамкі: гульні па развіццю радаснага настрою, вытрымкі, спрыту; гульні па развіццю ўвагі і хуткасці рэакцыі; гульні па выхоўванню добрых пачуццяў да звяроў; гульні на вобразнае выхаванне рухаў; гульні на асцярожнасць; знаёмства з паступовасцю развіцця раслін. Гульні з музыкай. Гульні-даганялкі. Гульні-пошукі.

ТЭМА 8. ФАЛЬКЛОР ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ – СКЛАДАНАЯ СУКУПНАСЦЬ ЖАНРАЎ

Разнастайнасць жанраў па сваёй прыродзе, часе ўзнікнення практычнай функцыянальнай прызначанасць і мастацкім афармленні. Дзіцячы фальклор – важная састаўная частка ўсёй духоўнай культуры народа.

ТЭМА 9. КАЗКІ

Казка як мастацкае, вуснае, у пераважнай большасці празаічнае апавяданне сацыяльна-бытавога, фантастычнага або навелістычна-авантурнага зместу, якое адлюстроўвае рэчаіснасць скрозь прызму фантазіі, выдумкі, фальклорнай умоўнасці і заключае ў сабе дыдактычна-навучальны сэнс. Казкі – з'ява, уласцівая духоўнаму жыццю кожнага народа. Асаблівасці беларускіх казак, працэс узнікнення і развіцця казак. Асноўныя групы беларускіх казак: аб жывёлах, чарадзейныя казкі, сацыяльна-бытавыя, авантурна-навелістычныя (прыгодніцкі характар). Казачнікі – таленавітыя выканаўцы казак.

ТЭМА 10. ПЕСНІ ДЗІЦЯЧАГА ФАЛЬКЛОРУ. ПРЫПЕЎКІ

Класіфікацыя, змест, форма і вобразная сістэма дзіцячых песень. Каляндарна-абрадавыя песні. Рознахарактарнасць песень. Жывёльны свет і сюжэтны дзіцячых песень. Жартоўныя песні. Прыпеўка – аднатрофная лірычная песенька самага разнастайнага зместу, якая складаецца з чатырох, радзей – шасці або васьмі радкоў. Дзіцячыя прыпеўкі (пястушкі) і іх тэматыка.

ТЭМА 11. НЕБЫЛІЦЫ

Небыліцы – творы народнай вусна-паэтычнай творчасці пра незвычайнасць дзеянняў, у іх адлюстраваных, пра відавочную неадпаведнасць уяўленням аб навакольным свеце. Небыліца як свайго роду гульня ў перавернуты свет, пра заведама немагчымыя рэчы. Найбольш пашыраныя сюжэты небыліц для дзяцей: жаніцьба і смерць камара; пра вошку, што парылася ў лазні і з палка звалілася; пра непаслухмяных казла, казу; пра сіўку-варонку, пра дзятла.

ТЭМА 12. ДАКУЧКІ

Дакучкі – творы без канца. Іх папулярнасць сярод дзяцей. "Сакрэт" іх бясконцасці ў пабудове: апошнія радкі патрабуюць паўтарэння ўсяго тэксту з самага пачатку.

ТЭМА 13. ЗАГАДКІ

Загадкі – адзін з самых старадаўніх жанраў вуснай народнай творчасці. Іншасказальнасць, вобразнасць форм загадак. Зашыфраванасць зместу – жанравая спецыфіка загадкі. Працоўная дзейнасць чалавека як першапачатковыя вытокі загадкі. Асноўнае прызначэнне загадак: праверка разумовых здольнасцей кемлівасці, вынаходлівасці дзіцяці. Змест казак і іх галоўная тэматыка. Загадкі пра характар сельскагаспадарчых работ, пра свойскіх жывёл і птушак, харчаванне і ежу, надворную пабудову і жыллё, адзенне і абутак, пра будову свету. Загадкі на сацыяльныя тэмы, пра звычаі, абрады, пра сямейны лад і грамадскія адносіны. Загадкі-пратэст супраць уціску і няволі, няроўнасці, несправядлівасці, супраць улады грошай. Вясельныя загадкі. Прытчы-загадкі, казкі-загадкі, легенды-загадкі, загадкі-пытанне, задачы. Асноўны прынцып пабудовы загадкі як мастацкага твору – замена аднаго прадмета другім. Галоўная функцыя загадкі – развіваць у дзяцей мастацка-вобразнае мысленне, паэтычны погляд на рэчаіснасць.

ТЭМА 14. БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ СКАРАГАВОРКІ

Скарагаворкі як твор – жанр гульнёвага фальклору. Асноўныя функцыі скарагаворак: весяліць, забаўляць дзіця, узбуджаць яго, рабіць бадзёрым, развіваць мову і яе хуткасць.   Разнастайнасць тэматыкі скарагаворак.

ТЭМА 15. БЕЛАРУСКІЯ ДЗІЦЯЧЫЯ НАРОДНЫЯ ГУЛЬНІ

Народная гульня як сродак усебаковага выхавання дзяцей. Калектыўнасць народных гульняў. Эмацыянальны стан усіх удзельнікаў гульні. Удзел дарослага ў гульнях і яго роля ў стварэнні адпаведнага настрою ўдзельнікаў. Роля асабістай ініцыятывы дзяцей у арганізацыі гульні. Разнастайнасць мелодый напеваў гульняў. Асноўныя задачы гульняў і іх напрамкі: гульні па выхоўванню любові да роднай мовы; выпрацоўка навыкаў хуткага бегу; выхоўванне добрых пачуццяў дапамогі слабейшаму; добрых сяброўскіх узаемаадносін; гульні з песняй з мэтай развіцця слыху, памяці, творчых здольнасцей; гульні на ўзаемавыручку ў бядзе. Кароткія дзіцячыя гульні. Гульні з дапамогай музыкі. Слоўныя задачы-гульні. Гульні-даганялкі.

ТЭМА 16. ФАЛЬКЛОР ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ ЯК АДНОСНА САМАСТОЙНАЯ СІСТЭМА

Дзіцячы фальклор і яго цесная сувязь з народнай творчасцю. Узаемадзейнасць з рознымі жанрамі дарослага фальклору. Сацыяльныя функцыі дзіцячага фальклору: пазнавальная, выхаваўчая, эстэтычная, камунікатыўная. Еднасць дзіцячага фальклору з усёй вусна-паэтычнай творчасцю народа.

ТЭМА 17. ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

Прыказкі і прымаўкі – лаканічныя творы, якія адлюстроўваюць багаты працоўны і жыццёвы вопыт народа, яго мудрасць, псіхалогію і светапогляд, маральна-этычныя і эстэтычныя ідэалы. Прыказка як створанае народам лаканічнае, вобразнае, устойлівае выслоўе з павучальным зместам, прамым і пераносным сэнсам. Закончанасць думкі ў прыказках. Незавершанасць думкі прымаўкі, яе роля ў раскрыцці сутнасці грамадскай або прыроднай з’явы, чалавечых рыс і ўчынкаў. Важнейшыя тэмы прыказак і прымавак у розныя гістарычныя часы: выкрыццё сацыяльнай несправядлівасці, сямейна-бытавыя адносіны, ухваленне лепшых рыс чалавека, праца чалавека, любоў да Радзімы, нянавісць да здраднікаў і ворагаў, гістарычныя падзеі, крытыка людскіх заганаў. Прыказкі і прымаўкі як своеасаблівая энцыклапедыя жыцця народа ў розныя гістарычныя эпохі, спадчына мінулага, жывая паэзія народа ў сучаснасці.

ТЭМА 18. ДЗІЦЯЧЫЯ АНЕКДОТЫ, ЖАРТЫ, ДОСЦІПЫ

Анекдот – невялікае, аднаэпізоднае апавяданне пра незвычайную смешную падзею, сітуацыю, рысу характару чалавека ці ўчынак, якое мае дасціпную неспадзяваную камічную развязку. Крытыка як аснова анекдотаў. Асаблівасці зместу анекдотаў: непрымірымасць да ўсяго адмоўнага і заганнага ў жыцці, аператыўнасць і актуальнасць. Жарт – апавяданне пра смешнае здарэнне, дасціпная насмешка. Незласлівы характар дзіцячых жартаў. Досціп або гумарэска – невялікі апавядальны твор, у якім трапна высмейваюцца прыватныя з’явы, паводзіны людзей. Добразычлівы характар смеху дзіцячых досціпаў. Мудрасць, дасціпнасць, знаходлівасць беларусаў у сатырычна-гумарыстычных жанрах фальклору. Разнастайнасць паводле зместу анекдотаў, жартаў, досціпаў на сямейна-бытавыя, маральныя і сацыяльныя тэмы. Мяккі, незласлівы гумар беларускіх дзіцячых анекдотаў, жартаў і досціпаў. Раскрыццё дзіцячай псіхалогіі, паказ спецыфікі ўспрымання дзецьмі навакольнага свету, своеасаблівасці разумення імі розных прыродных і грамадскіх з’яў у сатырычна-гумарыстычных жанрах фальклору.

ТЭМА 19. БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР’І

Прыкмета – прадказанне пэўнага выніку, заснаванае на аб’ектыўнай прычынна-выніковай залежнасці з’яў, падзей, дзеянняў і пацверджанае шматвяковым народным вопытам. Павер’е – уяўленне, якое імкнецца высветліць невядомы факт, наіўна растлумачыць паходжанне незразумелай з’явы, параіць ці засцерагчы, прадказаць будучыню, грунтуючыся выключна на вобразна-сімвалічных асацыяцыях. Народныя прыкметы і павер’і пра навакольны свет і прыроду, жывёльны і раслінны свет, прадказанні надвор’я, ураджаю. Чалавек, хата і сям’я ў прыкметах і павер’ях. Прыкметы і павер’і пра земляробства, жывёлагадоўлю, паляванне і рыбалоўства.

ТЭМА 20. ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ

Легенды – трывала замацаваныя ў фальклорнай традыцыі вусныя апавядальныя творы, у аснове якіх ляжаць звязаныя з гісторыяй народа фантастычныя ці апаэтызаваныя вобразы або ўяўленні, якія ўспрымаюцца як меўшыя месца ў жыцці. Разнастайнасць беларускіх легенд па сваёй тэматыцы: аб стварэнні сусвету, паходжанні людзей, розных жывёл і птушак, паходжанні назваў мясцовасцей, рэчак, азёр. Паданні – вусныя апавяданні пра рэальных асоб і сапраўдныя падзеі, пра населеныя пункты, мясцовасці. Найбольш распаўсюджаныя ў беларускім фальклоры паданні: гістарычныя, тапанімічныя, пра скарбы, пра разбойнікаў, гераічныя справы беларусаў. Пазнавальная функцыя паданняў і легенд для дзяцей.

ТЭМА 21. БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ГУЛЬНІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Народныя гульні і іх роля ў фарміраванні грамадскіх рыс характару дзяцей. Тэорыя паходжання дзіцячай гульні. Класіфікацыя дзіцячых беларускіх гульняў. Рухомыя фальклорныя гульні ў натуральным асяроддзі. Гульні з удзелам дарослага, роля дарослага ў больш творчым і працяглым характары гульні. Моўныя вытокі гулняў, іх гукавысотныя інтанацыі. Умоўны падзел гульняў на групы: для маленькіх і старэйшых. Асноўныя задачы гульняў і іх напрамкі: развіццё ўменняў адгадваць тактычныя прыёмы праціўніка; гульні па развіццю калектывізму; гульні па развіццю моцы; пошук вобразных рухаў; гульні па выхаванню павагі да старэйшых, велівасці, цярплівасці, павагі адзін да аднаго. Працяглыя дзіцячыя гульні. Слоўныя задачы-гульні. Гульні-карагоды.

## РАЗДЗЕЛ “ГУЛЬНЯВЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ СВЯТЫ І АБРАДЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА КАЛЕНДАРА”

### ТЭМА 1. ДЗІЦЯЧЫ ГУЛЬНЁВЫ ФАЛЬКЛОР СВЯТ І АБРАДАЎ КАЛЯНДАРНАГА ЦЫКЛУ: АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

Беларускія народныя зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія гульні для дзяцей. Іх агульная характарыстыка. Аграрная аснова народных дзіцячых гульняў каляндарна-земляробчых святаў і абрадаў.

### ТЭМА 2. НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

Народны-каляндар – сістэма адназначных у народнай свядомасці замацаваных ці рухомых дат, адна з форм духоўнай культуры народа. Традыцыйны народны беларускі каляндар як адлюстраванне поглядаў чалавека на навакольнае асяроддзе, шматлікія культурныя ўплывы. Узаемасувязь беларускага народнага календара. Народны каляндар і яго месца ў разнастайных фальклорных жанрах. З гісторыі календара.

### ТЭМА 3. НАРОДНЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ ГУЛЬНІ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ СВЯТ ЗІМЫ

Дзіцячыя гульнёвыя комплексы беларускага народнага абрадава-святочнага каляндарнага цыкла. Грамнічныя дзіцячыя “вяснянкі”, якімі “гукалі” вясну. Дзіцячыя масленічныя забавы беларусаў, іх своеасаблівасць, структура. Роля і месца дзяцей у спартыўна-гульнёвай частцы свята “Масленіца”.

### ТЭМА 4. ГУЛЬНЁВЫ ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ СВЯТ ВЯСНОВАГА ЦЫКЛУ

Асаблівасць, багацце і жанравая разнастайнасць дзіцячых гульнёвых комплексаў гукання вясны. Велікодныя дзіцячыя забавы. Гульні з фарбаванымі яйкамі: біццё і качанне яек, “яйка пад шапкай”. Веснавыя каляндарныя дзіцячыя гульні валачобніцтва, Юр’я, ваджэнне і пахаванне “стралы”, провады “русалкі”, траецкія гульні, гульні абраду “ваджэнне куста”.

### ТЭМА 5. НАРОДНЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ ГУЛЬНІ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ СВЯТ ЛЕТА

Купальскія дзіцячыя гульні і іх месца ў агульнай структуры свята. Роля і месца дзяцей у купальскіх кірмашах і карнавалах. Жніўныя гульні і песні свят народнага календара. Спасаўскія святкі і кірмашы.

### ТЭМА 6. ДЗІЦЯЧЫЯ ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ СВЯТ ВОСЕНІ

Асаблівасць гулліва-пацешлівага прызначэння свят восені. Дзіцячыя гульні забавы, іх месца на святочных восеньскіх кірмашах (Здзвіжанне, Пакровы, Дзень Маці, Мікола).

### ТЭМА 7. НАРОДНАЯ ГУЛЬНЯ ЯК ГРАМАДСКАЯ З’ЯВА

Гульня – самастойны від свядомай дзейнасці чалавека. Гульня як умоўнае адлюстраванне рэчаіснасці. Змена зместу народных гульняў у сувязі з развіццём грамадскай свадомасці. Роля і месца народнай гульні ў беражлівым захоўванні лепшых традыцый, звычаяў і нацыянальнага каларыту.

## РАЗДЗЕЛ “СВЯТЫ І СВЯТОЧНЫЯ ДНІ”

### ТЭМА 1. АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СВЯТ І СВЯТОЧНЫХ ДЗЁН НА БЕЛАРУСІ

Святы – сукупнасць звычаяў і абрадаў, якія выражаюць і замацоўваюць пэўныя погляды, пачуцці, адносіны людзей да прыроды і паміж сабою. Узнікненне свят у першабытным грамадстве. Святы і іх сувязь з каляндарным ці земляробчым цыкламі. Падзел свят на рэлігійныя, сінкрэтычныя (мелі рэлігійныя і безрэлігійныя элементы), безрэлігійныя. Сучасныя святы як урачыстасці, прысвечаныя важным гістарычным падзеям, грамадскім і палітычным з’явам, знамянальным датам, прафесіям. Падзел свят на грамадска-палітычныя, працоўныя, мастацкія. Святочныя дні – дакладна вызначаныя каляндарныя даты свят, свабодныя ад работы дні. Святочныя дні на Беларусі: 1 студзеня – Навагодняе свята, 7 студзеня – Раство (праваслаўнае), 8 сакавіка – Дзень жанчын, 1 траўня – Свята Працы, Радаўніца (па календары праваслаўнай канфесіі), 3 ліпеня – Дзень Незалежнасці, 7 лістапада – Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі, 25 снежня – Раство (каталіцкае).

### ТЭМА 2. СВЯТА ДОМА, ДВАРА

Мэты свята – актывізаваць суседскія зносіны, больш зацікавіць аднаго да другога жывучых пад адным дахам людзей. Асноўныя функцыі свята: пашырыць кола суседскіх зносін і выконваць функцыю выхавання, аб’яднанне і зближэнне людзей самых розных прафесій і ўзростаў. Працэс падрыхтоўкі свята. Традыцыйная праграма свята: урачыстае адкрыццё свята, расповед пра жыхароў дома ці двара, розныя конкурсы (кулінарных жыхароў, на лепшае афармленне балкона, дзіцячых малюнкаў і вырабаў), выстаўкі (хатніх кветак, ручнога вязання і вышыўкі), віктарыны (спартыўныя, літаратурныя).

### ТЭМА 3. СВЯТА ВУЛІЦЫ

Свята вуліцы як урачыстасць па месцы жыхарства ў гарадах і буйных вёсках. Тэрміны правядзення свята. Асноўныя часткі свята: мітынг-рэквіем, ушанаванне ветэранаў вайны і працы, перадавікоў вытворчасці, маці-гераінь, лепшых сямей, гульні, канцэрты, спаборніцтвы; конкурсы на званне “Дом высокай санітарнай культуры”, на лепшае афармленне балконаў, клумб і падвор’я; танцавальная праграма.

### ТЭМА 4. СВЯТА ГОРАДА

Асноўны лік урачыстасцей свята: тэматычныя вечары, мітынгі, мастацка-літаратурныя і спартыўна-масавыя мерапрыемствы, народныя гулянні, святочны гандаль, фальклорна-тэатралізаваны паказ, кірмаш, выставы вырабаў мастацкіх промыслаў і рамёстваў, кніжны кірмаш, дзіцячае свята з кавалькадай казачных герояў, скамарохамі і музыкантамі, водна-спартыўная частка свята, выступленне коннікаў, парад антыкварных аўтамабіляў, карнавал, моладзевы баль, святочны феерверк. Свята горада як прыклад фарміравання новай святочнай традыцыі з удзелам вялікай колькасці жыхароў горада і гасцей. Новыя і традыцыйныя народныя элементы, нацыянальныя рысы свята.

### ТЭМА 5. СВЯТА ВЁСКІ

З гісторыі ўзнікнення свята. Асноўныя часткі структуры свята: запрашэнні землякам, добраўпарадкаванне вёскі, тэатралізаванае прадстаўленне пра гісторыю вёскі, святочны кірмаш, конкурсы на лепшы двор, кулінарны выраб, букет кветак, ушанаванне ветэранаў і лепшых працаўнікоў, святочны канцэрт, спартыўна-гульнёвая праграма.

ТЭМА 6. СВЯТА ПЕСНІ

Свята песні – традыцыйныя выступленні прафесійных і самадзейных харавых калектываў, індывідуальных выканаўцаў, найчасцей прымеркаваныя да значных грамадскіх, палітычных ці гістарычных падзей. Праграма свята: творы харавой класікі, сучасных кампазітараў, народныя песні, удзел аркестраў (духавых, сімфанічных, народных інструментаў), танцавальных ансамбляў, салістаў (вакалістаў, інструменталістаў), чытальнікаў (дэкламатараў). З гісторыі ўзнікнення свята песні на Беларусі. Сучаснае свята “Славянскі базар у Віцебску”. Роля свята песні ў развіцці музычнай культуры краіны, садзейнічанні далучэнню да музыкі шырокіх народных мас.

ТЭМА 7. СВЯТА ПЕРШАЙ БАРАЗНЫ

Свята – урачыстасць, прысвечаная пачатку веснавых сельскагаспадарчых работ. Урачыстыя рытуалы, розныя магічныя дзеянні, прыкметы свята першага выхаду ў поле. Асноўны сэнс свята – услаўленне вясны, працы, маці – зямлі, хлебароба, перадавікоў працы. Народныя сімвалы і атрыбуты свята: хлеб-соль на рушніку, нацыянальнае адзенне, алегарычныя персанажы – вобразы Вясны, Зямлі, Ураджаю, Вяснянкі, вянкі на галавах дзяўчат, карагоды, веснавыя народныя песні. Асноўныя часткі свята і іх характарыстыка: тэатралізаваны паказ, вітанне Вясны ўдзельнікамі свята, прамовы кіраўнікоў гаспадаркі, спецыялістаў, ветэранаў працы, канцэрт мастацкай самадзейнасці, лінейка гатоўнасці сельскагаспадарчай тэхнікі, першая баразна, ушанаванне механізатараў, якія ўзаралі першыя ўчасткі калгаснага поля.

ТЭМА 8. СВЯТА ЎРАДЖАЮ

Свята ўраджаю – святкаванне заканчэння ўборкі ўраджаю. Першыя святы ўраджаю на Беларусі і іх прымеркаванні да пакроваў – старажытнага земляробчага свята заканчэння палявых работ. Асноўная мэта першых свят ураджаю – прапаганда сельскагаспадарчага вопыту. Састаўныя элементы свята: выстава ўзораў сельскагаспадарчай прадукцыі, прылад працы, дэманстрацыя прыёмаў апрацоўкі і ўгнаення глебы, кірмашы, парады тэхнікі, мастацкія інсцэніроўкі, канцэрты, танцы, гульні, спаборніцтвы, часам танцавальныя шэсці, конкурсы латарэі. Традыцыйныя сімвалы дажыначных абрадаў (апошні сноп жыта, ячменю, лёну, дажынкавы вянок, каравай з зерня новага ўраджаю) і іх месца ў святах ураджаю. Святочныя персанажы “Ураджай”, “Колас”, “Каласкі”. Сутнасць і значэнне сучаснага свята – святкаванне заканчэння ўборкі ўраджаю, дзень падвядзення вынікаў калектыўнай працы, ушанаванне пераможцаў спаборніцтва.

## РАЗДЗЕЛ “НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ”

ТЭМА 1. УВОДЗІНЫ Ў РАЗДЗЕЛ. АСНОЎНЫЯ ФОРМЫ І ВІДЫ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Народная творчасць, народнае мастацтва, фальклор. Народная творчасць як мастацкая, калектыўная творчая дзейнасць працоўнага народа, якая адлюстроўвае яго жыццё, погляды, ідэалы. Формы і віды народнай творчасці: паэтычныя творы, народная музыка, народны тэатр, народны танец, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Народная творчасць у шырокім сэнсе – усе віды непрафесійнага мастацтва (самадзейнае мастацтва). Фалькларысты, этнографы, мастацтвазнаўцы, якія займаюцца вывучэннем народнай творчасці.

## ТЭМА 2. БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ВУСНА-ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Від мастацкай творчасці народа, што адлюстроўвае рэчаіснасць у вобразах, створаных паэтычным словам. Фальклор і яго месца ў духоўным жыцці народа. Калектыўнасць, вуснасць бытавання, варыянтнасць – адметныя рысы фальклору, яго сувязь з працоўнай дзейнасцю чалавека. Уздзеянне вуснай народнай творчасці на прафесійнае мастацтва і драматургію. Фалькларыстыка як навука. Жанры беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці. Каляндарна-абрадавая паэзія і сямейна-бытавая паэзія. Нацыянальная спецыфіка беларускага фальклору. Фальклор і працэс яго развіцця. Фарміраванне новых відаў вусна-паэтычнай творчасці (прыпеўкі, народныя анекдоты). Зараджэнне і развіццё рабочага фальклору. Карэнныя змены ў беларускай народнай паэзіі сучаснага часу. Змены жанравага складу вусна-паэтычнай творчасці.

## ТЭМА 3. НАРОДНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ГУЛЬНІ

Народныя гульні – адна са старажытных форм народнай творчасці. Гульнёвыя дзеянні і іх асноўная мэта – паўплываць на прыродныя незразумелыя сілы. Абрадавая паэзія як аснова вытокаў традыцыйных народных гульняў. Беларускія гульні і іх сувязь з народным календаром. Пазаабрадавыя народныя гульні, іх агульная характарыстыка. Народныя гульні як сродак забавы, эстэтычнага і фізічнага выхавання людзей у сучасны час.

## ТЭМА 4. БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ТАНЕЦ

Народны танец – харэаграфічны фальклор, адна са старажытных форм народнай творчасці. Месца танцавальнай творчасці ў фальклоры беларускага народа. Сувязь народнага танца са святамі і абрадамі каляндарнага цыкла. Музычнае суправаджэнне беларускіх танцаў і карагодаў. Асноўныя групы беларускіх танцаў: карагоды, кадрылі, полькі, гарадскія бытавыя танцы, сольныя імправізацыйныя танцы. Балетныя трупы прыгонных тэатраў Беларусі і іх уздзеянне на народную харэаграфію. Дзейнасць трупы Ігната Буйніцкага па папулярызацыі беларускага народнага танца. Класіфікацыя беларускага харэаграфічнага мастацтва па танцавальных жанрах, іх характэрныя асаблівасці, кампазіцыя.

## ТЭМА 5. БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ МУЗЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Музычны фальклор беларусаў, яго гістарычны працэс фарміравання і развіцця. Беларуская песенная творчасць. Жанравыя разнавіднасці і нацыянальныя асаблівасці беларускай песні. Ідэйны і мастацкі змест песень. Музычны інструментарый і яго сувязь з гісторыяй, побытам і звычаямі беларускага народа. Музычныя інструменты. Трансфармацыя іх функцый у выніку змены сацыяльных і эканамічных умоў жыцця народа. Выкарыстанне музычных інструментаў у ігрышчах, сямейных і каляндарных абрадах і святах. Традыцыйныя музычныя ансамблі і іх склад. Развіццё народнай музыкі ў сучасны час. Знаёмства з народнымі музычнымі інструментамі, музычнымі калектывамі ва ўмовах музычнага каледжа.

## ТЭМА 6. БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ТЭАТР

Народны тэатр як адзін з відаў народнай мастацкай творчасці. Фальклорна-драматургічная аснова народнай тэатральнай творчасці беларусаў. Асноўныя этапы развіцця беларускага народнага тэатра. Тэатральнае народнае мастацтва чалавека і сувязь з працоўнай дзейнасцю. Мастацка-выяўленчыя і тэатральныя традыцыі беларускіх свят каляндарнага цыклу. Драматычныя элементы пазаабрадавых дзеянняў і тэатралізаваныя гульні. Мастацтва скамарохаў і ўплыў на іх творчасць тэатральных элементаў народных абрадаў. Беларуская драматургічная творчасць (інтэрмедыі, сцэнкі).

Школьная драма. Беларускі лялечны тэатр “Батлейка” і яго роля ў станаўленні і фарміраванні нацыянальных тэатральных традыцый. Народная драма беларусаў – найвышэйшая форма народнага тэатра, яе агульнаўсходнеславянскія і спецыфічныя рысы. Характэрныя асаблівасці тэатральна-гульнявой культуры народнай драмы. Знаёмства з дзейнасцю народных тэатраў горада, прафесійным тэатрам “Лялька”.

ТЭМА 7. БЕЛАРУСКІ КІРМАШ

Кірмаш – святочна абстаўлены пашыраны гандаль у пэўнай мясцовасці. Вытокі кірмашу. З гісторыі беларускага кірмашу. Этымалогія слова “кірмаш” і структура свята. Структура, характэрныя асаблівасці і тэрытарыяльныя адрозненні беларускіх атракцыёнаў, выстаў і латарэй. Гандлёвыя атракцыёны – адметная асаблівасць беларускіх кірмашоў. Забавы і пацехі беларускіх кірмашоў. Кірмашовы тэатр і яго вытокі. Азартныя гульні на кірмашах. Тэатральныя відовішчы кірмашоў Беларусі і іх адметныя асаблівасці. Традыцыі беларускіх кірмашоў і іх адраджэнне ў наш час. Вывучэнне беларускага кірмашовага фальклору (песні, танцы, спартыўныя гульні, атракцыёны).

## РАЗДЗЕЛ “ТРАДЫЦЫЙНЫЯ НАРОДНЫЯ ВЕДЫ БЕЛАРУСАЎ”

ТЭМА 1. НАРОДНАЯ МАРАЛЬ

Народная мараль як адна з асноўных форм культуры народа. Форма грамадскай свядомасці і адносін, своеасаблівы рэгулятар паводзін людзей у грамадскім і асабістым жыцці. Вытокі народнай маралі. Прынцыпы, нормы, ацэнкі народнай маралі і іх увасабленне ў фальклоры. Фальклор як бы напісаны маральны кодэкс народа, крытэрый паводзін. Праца – галоўны крытэрый народнай маральнай ацэнкі. Сямейна-бытавая мараль і яе месца ў народнай маралі. Народная мараль супраць захопніцкіх войнаў, за любоў да Радзімы. Народная мараль – бескарысны дар мінулых пакаленняў.

ТЭМА 2. НАРОДНЫ ЭТЫКЕТ

Народны этыкет як сукупнасць правіл паводзін і абыходжання, прынятых у асяроддзі працоўных, знешняе праяўленне культуры. Правілы народнага этыкету і іх праяўленні ў розных звычаях, абрадах, табу, фальклорных жанрах, у адносінах паміж юнакамі і дзяўчатамі, жанчынамі і мужчынамі. Абавязкі членаў сям’і і правілы іх паводзін згодна народнага этыкету. Народны этыкет як рэгулятар распарадку працоўнага дня, застольнага этыкету, узаемаадносін паміж бацькамі і дзецьмі. Лепшыя рысы, прынцыпы і нормы народнага этыкету – аснова сучаснага грамадскага этыкету.

ТЭМА 3. НАРОДНАЯ ПЕДАГОГІКА

Народная педагогіка – неафіцыйны своеасаблівы рэгулятар выхавання, паводзін. Вытокі. Месца народнай педагогікі ў фальклоры. Народная педагогіка і крытэрый паводзін. Уплыў на народную педагогіку палітыкі, ідэалогіі, мастацтва, рэлігіі. Праца – аснова народнай педагогікі, выхавання чалавечнасці. Узаемасувязь народнай педагогікі, народнай маралі і народнага этыкету.

ТЭМА 4. НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА

Народная медыцына як сукупнасць набытых народам ведаў пра гаючыя сродкі, лекавыя травы і гігіенічныя навыкі, іх практычнае выкарыстанне для зберажэння здароўя, папярэджання і лячэння хвароб. Вытокі народнай медыцыны. Сродкі народнай медыцыны і іх адлюстраванне ў фальклоры. Узаемасувязь навуковай медыцыны з вопытам народнай медыцыны.

ТЭМА 5. НАРОДНАЯ МЕТЭАРАЛОГІЯ

Народная метэаралогія – адна з важнейшых старажытных галін народных ведаў пра магчымае надвор'е ў бліжэйшы ці больш аддалены час. Шматвяковы сялянскі вопыт, назіральнасць, глыбокае веданне прыроды – аснова народных прадказанняў надвор'я. Прыкметы і народная метэаралогія. Народныя павер'і, заснаваныя на назіраннях людзей за жывёльным светам. Нябесныя свяцілы як прызнаныя арыенціры пры вызначэнні змен надвор'я. Народная метэаралогія ў фальклорных жанрах. Народныя прыкметы і іх навуковае абгрунтаванне.

ТЭМА 6. МІФАЛОГІЯ І МІФАЛАГІЧНЫЯ ВОБРАЗЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

Суадносіны паміж фальклорам і міфалогіяй як гістарычнымі формамі духоўнай культуры – значная праблема этнаграфіі і фалькларыстыкі. Міф – паэтычнае ўвасабленне прыродных з'яў, першабытная форма мастацкай творчасці. Міфалагічная творчасць як найважнейшая функцыя фантазіі, фальклору, паэзіі, іншых відаў мастацтва. Багацце міфалагічных вобразаў і матываў у беларускім фальклоры. Іх функцыі ў розных відах і жанрах народнай творчасці.

ТЭМА 7. БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ КУХНЯ

Гісторыя беларускай народнай кухні. Асноўныя прадукты харчавання, спосабы іх перапрацоўкі і захоўвання ў хатніх умовах. Стравы і напоі абрадаў і свят каляндарнага цыклу. Штодзённая ежа беларусаў. Перакуска. Першыя стравы. Мясныя вырабы. Стравы з бульбы, яек і малака, гароднiны, мукі. Парадак прыняцця ежы і харчовы рацыён на працягу дня і пары года. Беларускі этыкет паводзін за сталом. Характарыстыка посуду і хатніх рэчаў. Матэрыялы для вырабу хатніх рэчаў. Посуд: кухонны для прыгатавання страў, іх захоўвання і пераноскі; сталовы; гігіенічны; для піцця. Вырабы для інтэр'ера кухні. Гатаванне па зададзеных рэцэптах беларускіх страў і напояў у час правядзення мерапрыемстваў ва ўстанове адукацыі. Знаёмства з працэсам вырабу посуду і хатніх рэчаў народнымі майстрамі падчас прагляду і аналізу гарадскіх свят народных рамёстваў.

**РАЗДЗЕЛ "БЕЛАРУСКАЕ ТРАДЫЦЫЙНАЕ НАРОДНАЕ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА"**

ТЭМА 1. НАРОДНАЕ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА: ЯГО АСАБЛІВАСЦІ І ХАРАКТАР

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва як з'ява культурна-гістарычнага жыцця грамадства, яго цесная сувязь з матэрыяльным і духоўным жыццём. Паняцце "рамёствы" і "промыслы". Спалучэнне вырабаў неабходных у побыце рэчаў з асноўным заняткам простага народа – земляробствам. Інтэр'ер сялянскай хаты. Народнае мастацтва як вынік творчасці цэлых пакаленняў. Традыцыйнасць народнага мастацтва – сума тэхнічных правіл і прыёмаў, уяўленняў аб прыгажосці атрыманых чалавекам у спадчыну. Шырокадаступнасць народнага мастацтва як адна з галоўных пераваг перад іншымі відамі мастацкай дзейнасці. Спецыфічнасць народнай і прафесійна-мастацкай творчасці, іх узаемадзеянне.

ТЭМА 2. МАСТАЦКАЯ АПРАЦОЎКА ДРЭВА

Вырабы з дрэва і найбольш старажытныя традыцыі ў іх. Разнастайнасць і самабытнасць мастацкай апрацоўкі дрэва ў бытавых рэчах: прыладах працы, сялянскім посудзе, гаспадарчым начынні, транспартных сродках. Зааморфнасць (вырашэнне ў выглядзе птушкі ці жывёлы) многіх форм старых выдзеўбана-разьбяных вырабаў і іх сэнс. Найбольш пашыраныя віды беларускай народнай разьбы па дрэве. Трохгранна-выемчатая – найбольш старажытны і распаўсюджаны від разьбы. Шматварыянтнасць

дэкору: пілкі, зігзагі, рамбічныя сеткі. Асноўныя прадметы разьбы: прасніцы. Рэльефная разьба – з’ява ш беларускім побыце мала характэрная. Асноўныя прадметы разьбы: дошкі-формы для вырабу фігурнага пячэння (пернікаў) і ўзораў на тканіне (набойкі). Сюжэты вырабаў: конь, певень, каза, рыба, чалавек. Сучасныя вырабы і іх характарыстыка: палічкі, хлебніцы, набор для спецый, кухонныя прылады, дэталі мэблі. Скразная разьба (прапілоўка) як звычайнае аздабленне жылля. Найбольш пашыраныя матывы ў дэкоры жылля. Аб’ёмная (скульптурная) разьба. Асноўныя вырабы: ступы, начоўкі, чаўны, вуллі, чарпакі, бочкі, лыжкі, сальніцы, крыжы, каплічкі, мемарыяльныя слупы са скульптурай, фігуры чалавека і святых (касцы, жнеі, сейбіты, лірнікі, жабракі, героі народных казак, фальклорныя вобразы). Драўляная цацка як сродак абуджэння дзіцячай фантазіі, далучэння дзяцей да жыцця з яго паўсядзённай працай. Арыгінальны механізм драўлянай цацкі, яе “ажыўленне”. Разнастайнасць цацкі: пілавальшчыкі, дравасекі, кавалі, птушкі, мядзведзі на веласіпедах.

ТЭМА 3. РАЗЬБА ПА КОСЦІ

Разьба па косці – спосаб апрацоўкі косці з дапамогай сякеры, нажа, пілы. Характарыстыка рэчаў бытавога і дэкаратыўна-прыкладнога характару: чарнільніцы, рогі для віна, парахаўніцы, посуд, сувеніры, біжутэрыя. Матэрыял для стварэння рэчаў: рогі ласёў, аленяў, косці жывёл, птушак, клыкі дзікоў.

ТЭМА 4. ГАНЧАРСТВА

Ганчарства – вытворчасць ганчарных вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з гліны. Гаспадарчы посуд як асноўны від прадукцыі майстроў-ганчароў. Асноўныя віды ганчарных вырабаў: гаршкі, збанкі, міскі, макацеры, слоікі, глякі, патэльні, кубкі, маслёнкі, цукарніцы. Утылітарна-мастацкія вырабы з гліны. Дэкаратыўная кераміка. Вытворчасць кафлі, дахоўкі. Гліняная цацка як арыгінальны раздзел мастацкай керамікі.

ТЭМА 5. САЛОМАПЛЯЦЕННЕ

Асаблівасці і разнастайнасць беларускіх вырабаў з саломы. Вырабы гаспадарчага прызначэння – посуд: гарлачыкі, скрыначкі, шыяны, кублы. Формы посуду: цыліндрычныя, бочкападобныя. Рэчы ўтылітарна-мастацкага прызначэння: куфэркі, шкатулкі, фруктоўніцы, хлебніцы, лялечныя фігуркі жывёл, птушак і людзей, павукі, капелюшы. Формы рэчаў: круглыя, авальныя, прамавугольныя, сэрцападобныя. Найбольш папулярныя віды сучаснага саломапляцення: аб’ёмныя фігуркі людзей, птушак, жывёл, кампазіцыі на фальклорныя, бытавыя і гістарычныя тэмы; сумкі, пано, лялькі, біжутэрыя, хлебніцы, шкатулкі. Тэхніка саломапляцення: спіральнае і прамое, пляценне з плоскіх і аб’ёмных пляцёнак. Вырабы, аздобленыя аплікацыяй. Наведванне курсаў па саломапляценні (г. Віцебск).

ТЭМА 6. ПЛЯЦЕННЕ З ЛАЗЫ

Лозапляценне – адзін са старажытнейшых заняткаў чалавека, шырокаразвіты промысел. Рэчы з лазы і іх бытавое прызначэнне. Разнастайнасць тэхнічных прыёмаў пляцення.

ТЭМА 7. ВЫЦІНАНКА ЯК ВІД НАРОДНАЙ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЙ ТВОРЧАСЦІ

Выцінанкі (выразанкі, выразкі, выстрыганкі) – узоры, якія выразаліся з паперы. Асноўныя групы традыцыйных узораў выцінанак паводле кампазіцыі: разеткавыя (цэнтрычныя, замкнёныя), сіметрычныя (люстэркавыя), рапортныя.

ТЭМА 8. КАВАЛЬСТВА ЯК ВІД БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА РАМЯСТВА

Характарыстыка спецыяльных памяшканняў і прылад для кавальства. Мастацкі ўзровень вырабаў і іх віды: падковы, клямкі да дзвярэй, замкі, вілкі ў качарэжніку, сярпы, брычкі і вазкі.

ТЭМА 9. МАСТАЦКІ РОСПІС

Традыцыі мастацкага роспісу ў Беларусі. Пісанкі – амаль што адзіныя ўзоры народнага мастацкага роспісу ў Беларусі. Іх старажытнае, паганскае паходжанне. Роспіс па дрэве. Рэчы сялянскага побыту: вазкі, дугі, мэбля, талеркі, кухонныя камплекты, наборы для спецый, насценныя пано і іх дэкаратыўныя сродкі аздаблення. Роспіс па тканіне. Маляваныя насценныя дываны – масавы від народнага мастацтва. Асноўныя матывы роспісу дываноў і іх колеры. Роспіс па шкле. Яго роля ў дэкаратыўным аздабленні інтэр’ера народнага жылля. Прыёмы роспісу. Разнастайнасць роспісу па шкле па кампазіцыі, колераваму вырашэнню, стылістыцы.

ТЭМА 10. ВЫРАБЫ З ЦЕСТА

Разнастайнасць фігурных вырабаў з цеста і іх магічныя функцыі. Хлебныя птушачкі – арыгінальныя ўзоры народнай пластыкі. Фігурныя пернікі, іх роля ў вясельных абрадах і розных іншых урачыстых падзеях народнага побыту беларусаў. Асноўныя спосабы фармоўкі пернікаў: друкаваныя, абразныя, фармаваныя ад рукі. Беларускі вясельны каравай і яго разнастайнасць афармлення. Пякарская скульптура.

ТЭМА 11. ТКАЦТВА

Ткацтва – адзін з самых пашыраных відаў беларускай народнай творчасці. Тканыя вырабы і іх характарыстыка: адзенне, пасцель, ручнікі, абрусы, паясы, посцілкі, дываны. Ткацтва паясоў з ільняных, шарсцяных, баваўняных ці сінтэтычных нітак. Сувязь ткацтва са старадаўнімі народнымі звычаямі і абрадамі. Асноўная сыравіна для ткацтва на Беларусі: лён, воўна, радзей пянька (канаплянае валакно). Спосабы ткацтва. Фарбаванне тканых вырабаў. Асноўныя ўзоры ткацтва: геаметрычны арнамент (ромбы, крыжы), раслінны і жывёльны арнамент. Сучасны стан народнага ткацтва беларусаў. Наведванне майстэрні народных майстроў ткацтва (в. Альгова Віцебскага раёна).

ТЭМА 12. ВЫШЫЎКА

Вышыўка як від дэкаратыўна-прыкладной народнай творчасці беларусаў. Разнастайнасць узораў вышыўкі: сілуэтныя малюнкі жывёл і раслін, геаметрычны характар, сюжэтна-тэматычныя, фігуркі чалавека і птушак, букеты, гірлянды з кветак. Тэхніка выканання народнай вышыўкі: двухбаковае шво, вышыўка наборам (процяг, завалаканне), крыжыкам, паліхромная вышыўка гладдзю. Наведванне майстэрань народных майстроў вышыўкі ў горадзе Віцебску. Характарыстыка асноўных вырабаў вышыўкі: ручнікі, фіранкі, накідкі, шторы, парцьеры, навалачкі, адзенне, посцілкі, дываны. Сучасны стан вышыўкі. Яе каларыт і разнастайнасць узораў.

ТЭМА 13. БЕЛАРУСКІ РУЧНІК

Ручнік – адзін з асноўных прадметаў традыцыйнага арнаментальнага мастацтва беларусаў. Разнастайнасць ролі ручнікоў у народным побыце: практычная, дэкаратыўная і абрадавая. Асаблівасці дэкору ручнікоў. Сімволіка ручніка. Функцыі радзільнага і вясельнага ручніка. Ручнік у пахавальна-памінальных звычаях беларусаў. Віцебскія ручнікі – традыцыйныя тканыя ручнікі, якія выраблялі народныя майстры вёсак. Сучасныя ручнікі і месца ў іх традыцыйных беларускіх узораў.

ТЭМА 14. БЕЛАРУСКІ АРНАМЕНТ

Арнамент (упрыгожванне) – узор з рытмічна ўпарадкаваных элементаў для аздаблення твораў выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, архітэктурных пабудоў, прадметаў хатняга ўжытку. Тэхнічныя сродкі выканання: тканы, вышываны, плецены, набіваны, аплікацыйны, ляпны, гравіраваны, разьбяны, маляваны. Найбольш раннія формы арнаменту на Беларусі. Традыцыйны беларускі вышываны арнамент як складанае перапляценне некалькіх разнастайных па храналогіі і этнічных традыцыйных пластоў. Арнамент беларускіх тканых вырабаў і пераважнасць у ім ромба – геаметрычных узораў бранага (перабіранага) ткацтва. Арнамент плеценых і вязаных вырабаў. Арнаментальная разьба для аздаблення жылля, мэблі, прылад працы, посуду. Сціпласць узораў арнаменту беларускай керамікі. Змены ў традыцыйным арнаменце ў сучасны час. Новыя элементы ў нацыянальных формах арнаменту. Сучасная эмблематыка.

ТЭМА 15. БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ АДЗЕННЕ

Народнае адзенне – адметны здабытак нацыянальнай культуры Беларусі. Нацыянальная спецыфіка беларусаў і адзенне. Народнае адзенне як адна з найважнейшых этнічных прыкмет народнасці і нацыі. Асноўныя функцыі адзення ў гісторыі грамадства: магічная, абрадавая, адрозненні паводле полу, узросту, сямейнага становішча, саслоўнай, этнічнай і рэлігійнай прыналежнасці, паводле роду заняткаў і службовага становішча, утылітарная і эстэтычная. Гісторыя ўзнікнення адзення і складаны шлях эвалюцыі. Асноўныя тыпы касцюмаў паводле канструкцыі: драпіраваны, накладны і расхінны, – іх характарыстыка. Вытокі беларускага народнага адзення, яго эвалюцыя. Аснова беларускага народнага адзення мужчын і жанчын. Традыцыйны комплекс адзення. Абрадавы касцюм – адзін з важнейшых элементаў традыцыйнай і сучаснай абраднасці беларусаў. Народныя строі як традыцыйныя комплексы беларускага народнага адзення, характэрныя для пэўнай мясцовасці. Каларыт і арнаментацыя беларускага нацыянальнага касцюма. Асаблівасці развіцця сучаснага беларускага нацыянальнага касцюма: зближэнне з традыцыйным гарадскім касцюмам, арыентацыя на мясцовыя традыцыі народнай культуры.

ТЭМА 16. СТАН СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЙ ТВОРЧАСЦІ

Асаблівасць сучаснага беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Гарманічнае спалучэнне практычнасці і прыгажосці. Вырабы сучасных народных майстроў, іх непаўторнасць, мясцовы каларыт, нестандартызаванасць. Сувенір як адна з асноўных функцый твораў сучаснага народнага мастацтва. Экскурсія на абласную выставу беларускай народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Інтэр’ер сучаснага жылля.

## РАЗДЗЕЛ “БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЛЯНДАРНА-ЗЕМЛЯРОБЧЫЯ СВЯТЫ І АБРАДЫ”

ТЭМА 1. УВОДЗІНЫ Ў РАЗДЗЕЛ

Месца і роля беларускіх народных каляндарна-земляробчых святаў і абрадаў у агульнай сістэме выхавання чалавека. Паняцці “традыцыя”, “звычай”, “абрад”, “свята”, “прысвятак”, “гульня”, “ігрышча”. Этапы станаўлення і развіцця беларускай народнай абраднасці. Адлюстраванне сучасных этнічных працэсаў у святах і абрадах каляндарнага цыкла. Класіфікацыя народных каляндарна-земляробчых святаў і абрадаў. Абрадавае кола беларускага народнага календара.

## *ПАДРАЗДЗЕЛ 1. НАРОДНЫЯ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫЯ СВЯТЫ ЗІМЫ*

ТЭМА 2. ЗІМОВЫ ПЕРЫЯД БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ЗЕМЛЯРОБЧАГА КАЛЕНДАРА, ЯГО ПАДРЫХТОЎЧЫ ХАРАКТАР, АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

Зімовыя справы ў жыцці чалавека. Падрыхтоўка прылад працы да земляробчага перыяду. Магічныя дзеянні падчас зімовых святаў, якія спрыялі будучаму ўраджаю. Прыкметы і павер'і, звязаныя з угадваннем будучага вясенне-летняга сезону і будучай ураджайнасці.

ТЭМА 3. ЗІМОВЫ МІКОЛА

Мікола – старадаўняе каляндарна-абрадавае свята заступніка земляроба. Святкаванне Міколы. Абрады, звязаныя з будучым ураджаем. Прыкметы і павер'і на Міколу.

ТЭМА 4. БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ АБРАДАВЫ СВЯТОЧНЫ КАЛЯНДАРНЫ ЦЫКЛ

Калядна-народны аграрны абрад дахрысціянскага паходжання, свята зімовага сонцастаяння. Асноўнае прызначэнне свята: паскорыць набліжэнне цёплых дзён, забяспечыць добры ўраджай у надыходзячым годзе з дапамогай магічных дзеянняў. Этымалогія слова “каляда”. Характэрныя рысы славянскага свята. Асноўныя элементы і функцыянальны напрамак каляднай абраднасці беларусаў. Сельскагаспадарчая і шлюбная магіі. Аграрная аснова народнай каляндарнай абраднасці. Структура, характэрныя асаблівасці і адрозненні абрадаў калядавання, шчадравання і засовак. Абрадавыя вячэры – куцці: першая – Вялікая, другая – Багатая, трэцяя – Галодная. Беларускі Шчодры вечар (Шчадрэц, Шчадруха, “стары” Новы год) і яго структура: святочная ежа, запрашэнне мароза да святочнай вячэры, рытуальны дыялог гаспадара і жонкі на багаты ўраджай. Валачобнікі. Навагоднія віншаванні. Калядныя песні. Дзявочае варажэнне. Гульні на вольным паветры. Танцы. Гістарычнае развіццё, агульныя рысы і тэрытарыяльныя адрозненні беларускіх народных ігрышчаў. Народныя гульні і іх магічныя дзеянні. Калядныя тэатралізаваныя гульні: пераапрананне ў “цыганоў”, ваджэнне “Казы” або “Каня”/ “Кабылы, або “Жураўля”, “Жаніць Цярэшку” (“Жаніцьба Цярэшкі”), “Яшчур” і яго сучаснае гучанне. Сучасныя народныя гульні як сродак забавы і выхавання людзей. Хрысціянскія святы ў перыяд каляднага цыкла: нараджэнне Хрыста (Раство), Васілле (Дзень святога Васілія Вялікага), Вадохрышча (Хрышчэнне Хрыста).

ТЭМА 5. СВЯТА “ГРАМНІЦЫ – СТРЭЧАННЕ”

Грамніцы (Стрэчанне, Грамнічнік, Устрэчанне) – земляробчае зімовае свята на сустрэчы зімы і лета (вясны), свята свечкі і “жывога агню”. Этымалогія слова “Грамніцы”. Народныя метэаралагічныя прыкметы ў дзень свята. Выкананне першых “вяснянак”, якімі “гукалі” вясну. Грамнічная свечка і яе асвячэнне ў царкве – асноўны рытуал свята.

ТЭМА 6. МАСЛЕНІЦА

Масленіца – своеасаблівае свята сілы, моцы фізічнага і псіхалагічнага здароўя чалавека, што здолеў Зіму, дачакаўся яе канца і надыхода Вясны. Агульнаславянскі характар і традыцыйная аснова праводзін зімы і сустрэчы вясны. Генезіс свята і этымалогія назвы “масленіца”, альбо “сырная нядзеля”, “сырніца”. Функцыянальны напрамак рытуалаў, абрадаў усходніх славян. Асаблівасці масленічнага комплексу беларусаў. Структура і тэрытарыяльныя адрозненні аграрных, сямейна-радавых і памінальных абрадаў. Земляробчыя і любоўна-сямейныя клопаты чалавека – аснова

масленічных звычаяў і абрадаў, песень. “Масленічныя Дзяды” (Мясаедныя, Паставыя, Зімовыя) – пачатак Масленічнага тыдня. Рытуальныя абрады і ежа. Традыцыйная гульнёвая аснова свята. Агульнаславянскія масленічныя забавы і іх характарыстыка. Беларускія масленічныя забавы, іх своеасаблівасць. Структура забаў. Спартыўна-гульнёвая частка беларускага свята “Масленіца”.

ТЭМА 7. ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ Ў СУЧАСНЫХ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ СВЯТАХ ЗІМОВАГА ЦЫКЛУ

Карэнныя змены ў традыцыйнай зімовай абраднасці ў сучасны перыяд. Узвядзенне сучасных этнічных працэсаў на святкаванне Новага года. Новае разуменне абрада “калядаванне” і яго асобных элементаў. Агульнанацыянальныя і тэрытарыяльныя асаблівасці сучаснага абраду “калядавання”. Адраджэнне свята праводзін зімы на Беларусі, яго структура. Праблемы выкарыстання ў свяце беларускіх этнатрадыцый. Прагляд і аналіз народных святкаванняў зімовага цыкла ў г.Віцебску. Удзел школьнікаў / навучэнцаў / студэнтаў у падрыхтоўцы і правядзенні гарадскога свята “Віцебскія калядкі”, “Масленіца”, у абрадах калядавання.

## *ПАДРАЗДЗЕЛ 2. НАРОДНЫЯ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫЯ СВЯТЫ ВЯСНЫ*

ТЭМА 8. ВЕСНАВЫ ПЕРЫЯД БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ЗЕМЛЯРОБЧАГА КАЛЕНДАРА: АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

Агульнаславянскі характар і традыцыйная аснова веснавых каляндарна-абрадавых святаў. Веснавыя традыцыі і абрады ўсходніх славян. Сустрэча вясны, пачатак палявых работ, прылёт птушак, час веснавых усходаў і выгану жывёлы на пашу – адказныя перыяды ў жыцці земляроба, асноўныя напрамкі каляндарна-абрадавых дзеянняў.

ТЭМА 9. СВЯТЫ СУСТРЭЧЫ ВЯСНЫ

Структура, функцыянальны напрамак і адметныя асаблівасці беларускіх народных каляндарна-абрадавых святаў сустрэчы вясны (Аўдакея, саракі, Аляксей, “Камаедзіца”). Абрадавая ежа. Песні беларусаў на святы сустрэчы вясны (прызыванне / гуканне вясны, вяснянкі, валачобныя). Веснавыя карагоды.

ТЭМА 10. БЛАГАВЕШЧАННЕ – СТАРАЖЫТНАЕ ВЕСНАВОЕ СВЯТА НАРОДНАГА КАЛЕНДАРА

Благавешчанне (Звеставанне, Дабравешчанне) – свята надыходу вясны, прылёту буслоў. Павер’і, забабоны і прыкметы ў дзень свята. Структура свята: выкананне абрадавых песень “гукання вясны” (вяснянкі з узвышаных месцаў; лецечка “адмыкаці”, зіму “замыкаці”; святочныя перагукі, святочныя вогнішчы і плыты; вызваленне птушак на волю; ваджэнне “танкоў” з песнямі, аграрны звычай першага выгану жывёлы ў поле. Асаблівасці песень-вяснянак. Багацце і жанравая разнастайнасць гульняў гукання вясны.

ТЭМА 11. ВЯЛІКДЗЕНЬ – СЛАВЯНСКАЕ СВЯТА АБУДЖЭННЯ ПРЫРОДЫ

Вялікдзень – веснавое свята старажытных славян у гонар сонца, абуджэння прыроды і надыходу “вялікіх” дзён палявых работ. Вялічка – дахрысціянскае веснавое святкаванне панавання сонца. Найважнейшыя бытавыя прыкметы і характэрныя асаблівасці Вялікадня ў беларусаў. Валачобныя абходы – спецыфіка беларускай велікоднай абраднасці. Этымалогія слова “валачобнікі”, структура і тэндэнцыі развіцця абрада. Прымеркаванне Вялікадня хрысціянскай царквой да свята ўваскрэсення Хрыста. Абрадавая ежа. Велікодныя хрысціянскія і свецкія забавы. Ігрышча – верх усіх велікодных забаў для беларусаў. Велікодныя гульні і іх асаблівасць.

ТЭМА 12. РАДАЎНІЦА – ДЗЕНЬ ПАМІНАННЯ ПАМЕРЛЫХ

Радаўніца (Радуніца, Радаўніцкія Дзяды) – свята ўсходніх славян, звязанае з культам продкаў. Структура памінальнага абрада ў беларусаў. Абрадавая ежа.

ТЭМА 13. ЮР'Я – СТАРАДАЎНЯЕ ЗЕМЛЯРОБЧАЕ СВЯТА ПЕРШАГА АБРАДАВАГА ВЫГАНУ ЖЫВЁЛЫ Ў ПОЛЕ

"Юрай" як аграрна-жывёлагадоўчае свята. Свята пастухоў. Народныя паданні і звычаі. Юр'я – абаронца хатняй жывёлы, асабліва кароў, звяроў, апякун земляробства, заступнік сельскай гаспадаркі. Структура беларускага народнага свята. Юр'еўскія песні. Забаўныя (пацяшальныя) элементы абрадаў юр'еўскага цыкла. "Ягорый" – народнае прадстаўленне з лялькамі. Юр'ева горка ў Віцебску. Народнае гулянне. Юраўскі кірмаш.

ТЭМА 14. ВЕСНАВЫ АБРАД "СТРАЛА"

"Страла", ваджэнне і пахаванне "стралы" ("сулы") – даўні ахоўна-засцерагальны і магічна-аграрна-веснавы абрад. Асноўныя рытуальныя дзеянні: збор удзельнікаў, ваджэнне карагодаў, гульні, качанне па полі, закопванне "Стралы".

ТЭМА 15. МІКОЛА – СТАРАДАЎНЯЕ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЕ СВЯТА АПЕКУНА ЗЕМЛЯРОБСТВА

Гісторыя ўзнікнення свята. Структура свята. Рытуальныя дзеянні.

ТЭМА 16. АБРАДЫ "СЁМУХА" – РУСАЛЬНАГА ЦЫКЛА

Агульнаславянскі характар абрадаў "Сёмуха" (Тройца, Сямік, Зялёныя святкі). Генезіс, структура і аграрна-шлюбны напрамак абрадаў. Рэлігійныя і свецкія напластаванні, трансфармацыя ў працэсе гістарычнага развіцця. Тэрытарыяльныя абрадавыя комплексы беларусаў, іх структура. Абрад "куст" ("ваджэнне куста", завіванне вянкоў) – спецыфіка беларускай веснавой абраднасці. Сёмушныя (Траецкія, Сярэднія) Дзяды – пятніца перад Сёмухай. Духавая субота (Святы дух, Стаўроўскія Дзяды, Сёмка) – Дзяды ў суботу перад Сёмухай, Троіцай. Зялёная (Кляновая) субота (Зелянец, Май, Зялёная субота, Зялёныя святкі) – свята маладой зеляніны перад Сёмухай. Варожбы. Асвячэнне травы. Русальны (Грамны, Праводны, Духавы) тыдзень – наступны тыдзень пасля Сёмухі, дні праводзін вясны. Ушанаванне культу расліннасці і продкаў. Вераванні, засцярогі, павер'і, прымхі ад русалак. Структура беларускага свята: выраб "русалкі", траецкія гульні, гульні абраду "ваджэнне куста".

ТЭМА 17. ВЫКАРЫСТАННЕ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У СУЧАСНЫХ КАЛЯНДАРНЫХ СВЯТАХ ВЕСНАВОГА ЦЫКЛА

Працэс развіцця веснавой абраднасці беларусаў на сучасным этапе і яго асаблівасці. Змены ў традыцыйная каляндарнай народнай абраднасці ў сучасны час. Традыцыйнае і новае ў веснавых святах беларусаў: провідкі, заворванне (свята першай баразны), прызыванне (гуканне) вясны, "куст". Стандартызацыя афіцыйнай часткі святаў, адсутнасць масавага пасляабрадавага дзеяння як вынік фармальнага падыходу да выкарыстання народных традыцый. Магістральныя напрамкі ўдасканалення сучасных веснавых каляндарных святкаванняў. Прагляд і аналіз народных каляндарна-абрадавых свят вясны ў культурна-асветных установах горада Віцебска і Віцебскага раёна. Удзел у святах.

## *ПАДРАЗДЗЕЛ 3. НАРОДНЫЯ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫЯ СВЯТЫ ЛЕТНЯГА ЦЫКЛА*

ТЭМА 18. ЛЕТНІ ПЕРЫЯД ЗЕМЛЯРОБЧАГА КАЛЕНДАРА: АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

Летнія народныя каляндарна-абрадавыя святы і іх мэты: зберажэнне збажыны ў пару даспявання, спрыянне паспяховаму збору ўраджаю. Агульнаславянскі характар і традыцыйная аснова летніх святаў. Летнія традыцыі і абрады ўсходніх славян.

ТЭМА 19. КАСЕЦКІЯ АБРАДЫ, ТРАДЫЦЫІ І ЗВЫЧАІ БЕЛАРУСАЎ

Касьба – пачатак летняга сезона ў жыцці і працы земляроба. Пакосныя традыцыі, абрады і звычаі беларусаў. Талочная грамада. Касецкія (пакосныя) песні. Бытавыя матывы ў касецкіх песнях.

ТЭМА 20. КУПАЛЛЕ – СВЯТА Ў ГОНАР АГНЮ І СОНЦА

Купалле (Купала, Ян, Іван) – свята летняга сонцастаяння, форма адлюстравання аграрна-жывёлагадоўчага культу. Свята Купалле як адно з найбольш яскравых, маляўнічых і паэтычных абрадаў у беларусаў. Этымалогія (трактоўка) слова “Купалле”. Генезіс купальскіх звычаяў і абрадаў, іх агульнаславянскія рысы. Купальскія павер’і беларусаў, анімістычныя ўяўленні пра свет. Папараць-кветка – Купальскае павер’е. Структура свята: збор купальскіх зёлак, купальскае вогнішча, пудзіла, выбар дзяўчыны Купалінкі, абрадавая вячэра каля вогнішча, пошук папараці-кветкі, варажба, пазіранне за ўсходам сонца, купанне ў рацэ на зары, кірмаш. Павер’і, забабоны і прымхі на Купалле. Культы, звязаныя з абрадам Купалля: салярны (культ Сонца), культ вады і расліннасці. Рытуальныя стравы. Кумленне (кумаўство і пабрацімства). Легенды і паданні. Песні і танцы ў купальскім абрадзе, карагоды і іх асаблівасць. Купальскія гульні і іх месца ў структуры свята, неад’емная частка абраду. Купальскі кірмаш і элементы карнавалу ў беларускім свяце “Купалле”. Агульнанацыянальныя рысы і тэрытарыяльныя асаблівасці беларускай купальскай абраднасці. Кампазіцыйная пабудова і тэрытарыяльныя адрозненні завяршэння свята. Выкарыстанне народных традыцый у сучасным свяце летняга сонцастаяння. Працэс развіцця, разнастайнасць жанравых форм і структура сучаснага Купалля.

ТЭМА 21. ПЯТРО – СТАРАЖЫТНАЕ ЗЕМЛЯРОБЧАЕ СВЯТА КУЛЬТА ЗЕЛЯНІНЫ

Пятро (Пятрок) – апякун хлеба і хлебаробаў у беларускім фальклоры. Аграрна-магічная і шлюбная накіраванасць свята. Структура свята: варожбы, пятроўскія карагоды, песні, кумаванне дзяўчат з хлопцамі, гульні, частаванні.

ТЭМА 22. ІЛЛЯ – РАСПАРАДЧЫК ДАЖДЖОЎ І НАВАЛЬНІЦ, АПЯКУН ЗЕМЛЯРОБСТВА

Ілля (Ілья) – абаронца ад нячыстай сілы. Свята “Ілля” ў народным календары – канец лета. Валачобныя песні. Ілля – пачатак пахаладанняў і дажджоў.

ТЭМА 23. ЖНІЎНЫЯ СВЯТЫ НАРОДНАГА КАЛЕНДАРА

Жніўныя святы ўсходніх славян: агульная характарыстыка. Жніво – вяршына гаспадарчай дзейнасці земляроба. Звычаі і абрады жніва. Зажынкі – першы (пачатковы) этап жніва. Беларускае свята пачатку ўборачнай працы – “Зажынкі”. Эвалюцыя яго абрадавых форм. Павер’е аб “заломах” (“завітках”, “закутках”). Абрад “Пакрыванне поля” – асаблівасць абрадавага комплексу жніва. Пачатак зажынкаў у Віцебскай губерніі. “Гаспадар-снапок” – першы сноп абраду “Зажынкі”. Патрабаванні да зажынальніцы.

Святочная вячэра. Дажынкі – другі (заключны) этап жніва. Жніўная жаночая талака. Звычаі абраду “Дажынкі”, звязаныя з прыходам гаспадара ў поле падчас жніва. Абрад “Завіванне барады” і яго структура. Асаблівасці абраду на Віцебшчыне. Калектыўнае частаванне жней. Абрадавая ежа. Абрадавыя дзеянні, звязаныя з уборкай збажыны з поля і яе абмалотам. Павер’і, забабоны і прымхі ў жніво. Жніўныя песні і іх адрозненне ад іншых відаў каляндарна-абрадавай паэзіі: песні працы, сямейных і сацыяльных адносін, прыродных вобразаў сонца, нівы і ветру. Падзел песень на зажынкавыя, уласна жніво і дажынкавыя.

ТЭМА 24. ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ Ў СУЧАСНЫХ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ СВЯТАХ ЖНІВА БЕЛАРУСАЎ

Класіфікацыя і агульная характарыстыка сучасных беларускіх святаў жніва. Выкарыстанне народных традыцый у святах жніва. Этнаграфічныя асаблівасці святаў жніва. Структура сучасных святаў жніва. Сельскагаспадарчыя абрады і рытуалы ў полі. Праблема адраджэння ў святах жніва масавага пазаабрадавага дзеяння. Сучаснае агульнарэспубліканскае свята “Дажынкі”. Жніво і гарадская талака на вёсцы.

ТЭМА 25. СПАСАЎСКІЯ СВЯТКІ

Спас (Спасаўка) – старажытнае свята земляробчага календара, прымеркаванае да часу выспявання садавіны, гародніны. Спас – мяжа паміж летнім і асеннім цыклам работ. Свята грамадзянскага спажывання пладоў новага ўраджаю. Звычаі свята “Спас” і размеркаванне яго па тэрмінах правядзення. Першы Спас – мядовы. Макавей. Другі Спас – яблычны. Трэці – хлебны, арэхавы. Спасаўскія кірмашы.

ТЭМА 26. ПРАЧЫСТАЯ – СВЯТА ЎРАДЖАЮ

Прачыстая (Першая Прачыстая, Вялікая Прачыстая, Аспажа, Гаспажа, Спажа, Зялёная) – свята асвячэння “барады” – апошняга снапка. Свята пачатку засевак.

***ПАДРАЗДЗЕЛ 4. АСЕННІ ПЕРЫЯД ЗЕМЛЯРОБЧАГА КАЛЕНДАРА***

ТЭМА 27. АСЕННІЯ СВЯТЫ ЎСХОДНІХ СЛАВЯН, ІХ АГУЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ Ў БЕЛАРУСАЎ

Культ сонца – аснова святаў. Працоўная дзейнасць земляроба ў восеньскіх святах. Шырокая аграрная аснова святаў. Нацыянальныя асаблівасці беларускіх святаў восені: бытаванне талочных песень, песень працоўнай узаемадапамогі. Асаблівасці гулліва – пацешлівага прызначэння святаў. Перавага ў песнях перадвясельных матываў, лірычнага пачатку.

ТЭМА 28. БАГАЧ – СТАРАЖЫТНАЕ СВЯТА ЗАКАНЧЭННЯ ЎБОРКІ ЗБОЖЖА

Багач (Багатнік, Багатуха, Другая Прачыстая) – земляробчае свята пасля заканчэння жніва і сяўбы. Пара адноснага дастатку ў селяніна. Час вяселляў. Структура свята: лубка жыта з свечкай – “багач” і яго падрыхтоўка, абыход хат, абнос “багача” вакол статка, агульная вячэра.

ТЭМА 29. ЗДЗВІЖАННЕ – СВЯТА “ЗАКРЫВАННЯ” ЗЯМЛІ НА ЗІМУ

Народнае тлумачэнне назвы свята “Здзвіжанне” (Уздзвіжанне, Звіжанне, Уздзвіжанне). Легенда аб Здзвіжанні. Звычаі, павер’і, забабоны. Уздзвіжанне як хрысціянскае свята, звязанае з ушанаваннем крыжа. Святочныя кірмашы, фэсты.

ТЭМА 30. АБРАД “ЖАНІЦЬБА КОМІНА”

“Жаніцьба коміна” (“жаніцьба лучніка”, “жаніцьба пасвета”) – абрад культу агню – багача, хатніх духаў – продкаў. Мэтанакіраванасць і структура абраду. Абрадавыя пажаданні і песні.

ТЭМА 31. ПАКРОВЫ – НАРОДНАЕ ЗЕМЛЯРОБЧАЕ СВЯТА ЗАКАНЧЭННЯ ЎСІХ ПАЛЯВЫХ РАБОТ

Пакровы (Пакроў, Трэцяя Прачыстая) – народнае свята глубокай восені, пачатак зімы. Пакроў у народным уяўленні. Прыкметы на прагноз надвор’я. Пакроў – вясельная пара. Пакроў Божай Маці як праваслаўнае свята. Дзень маці ў Рэспубліцы Беларусь. Святочныя кірмашы і фэсты.

ТЭМА 32. АСЯНІНЫ – ДЗЕНЬ ПАМІНАННЯ ПРОДКАЎ, АСЕННІЯ ДЗЯДЫ

Асяніны (Дзяды, Змітраўскія дзяды) – старадаўняя ўрачыстасць ушанавання памяці сваіх папярэднікаў. Асноўныя часткі Асянін: багаты абрадавы стол, уборка падвор’я, памінальная вячэра, запрашэнне нябожчыкаў на вячэру.

ТЭМА 33. ПІЛІПАЎКА

Піліпаўка як апошняя мяжа ў гадавым калаўроце жыцця працоўнага чалавека. Піліпаўскія вячоркі (попрадкі, супрадкі) і іх асаблівасці. Народная гульня “Яшчар”. Прыкметы на надвор’е.

ТЭМА 34. ВЫКАРЫСТАННЕ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У СУЧАСНЫХ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫХ СВЯТАХ ВОСЕНІ

Класіфікацыя і агульная характарыстыка сучасных беларускіх святаў асенняга цыкла. Прыстасаванне старажытных абрадавых форм да сучаснага побыту. Узнікненне, станаўленне і развіццё на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь “Свята ўраджаю”. Яго характэрныя рысы. Народныя традыцыі ў сучасным свеце “Змітраўскія Дзяды”.

ТЭМА 35. ЗАКЛЮЧЭННЕ ДА РАЗДЗЕЛУ

Культурна-гістарычная пераемнасць народных традыцый пры арганізацыі каляндарна-абрадавых святаў земляробчага гадавога кола ў сучасны час.

## РАЗДЗЕЛ “НАРОДНАЯ СЯМЕЙНА-ТРАДЫЦЫЙНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ”

ТЭМА 1. УВОДЗІНЫ Ў РАЗДЗЕЛ

Народная сямейна-традыцыйная абраднасць беларусаў як састаўная частка сістэмы выхавання чалавека, частка быту. Гісторыя станаўлення і развіцця народных сямейна-бытавых абрадаў. Народная сямейна-бытавая абраднасць як від беларускага фальклору, адзін з самых папулярных і распаўсюджаных на ўсёй Беларусі відаў народнай вусна-паэтычнай творчасці.

Асноўныя этапы жыцця чалавека і народная сямейная абраднасць беларусаў.

ТЭМА 2. РАДЗІННАЯ АБРАДНАСЦЬ

Комплекс традыцыйных радзінных звычаяў і абрадаў: дародавы, родавы і пасляродавы цыклы. Уяўленні, вераванні, забароны, якія суправаджалі цяжарнасць жанчыны. Звычаі і абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. Імянарачэнне дзіцяці, наведванне парадзіхі. Звычаі і абрады, што папярэднічалі хрышчэнню. Рэлігійны абрад хрышчэння. Святкаванне хрэсьбін: запрашэнне суседзяў, сваякоў на ўрачыстасць; збор

запрошаных у хаце нованароджанага; сустрэча кумоў з царквы; агульнае частаванне; абрад “перапівання кумоў”; падзел “бабінай” кашы – спецыяльнай абрадавай стравы; абрад “цягаць бабу на баране”. Звычаі і абрады прыняцця нованароджанага ў сям’ю і грамадства: ачышчэнне дзіцяці праз купанне пасля царкоўнага мірапамазання (“муравінкі”, “жмурыкі”, “здзіўкі”, “мур змываць”), з’яўленне першага зуба ў немаўляці, яго першыя крокі і першае пастрыжэнне (“стрыжкі”, “пастрыжыны”). Сучасны стан радзіннай абраднасці беларусаў і яе асаблівасць. Хрэсьбінныя песні як нацыянальны здабытак беларусаў. Беларускія традыцыі ранняга далучэння дзяцей да працы. Звычаі паўналецця, сталасці ў беларусаў.

ТЭМА 3. БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ ВЯСЕЛЛЕ

Вяселле як комплекс абрадаў і звычаяў, якія суправаджаюць урачыстасць заключэння шлюбу. Беларускае народнае вяселле: яго асноўныя элементы і часткі. Сватанне (дружкі) – увесь падрыхтоўчы перыяд вяселля. Шматварыянтнасць сватання на Беларусі. Звычаі давясельнага абраду “Сватанне”: выглядзіны (агляды, благаславенне, пярэпыты, даведкі, запоіны, выкуп, дарэнне, агледзіны), умовіны, дамовіны, заручыны, змовіны, “перапой”, расплятанне касы на заручынах, пакрыванне маладой хусткай). Перадвясельная абраднасць беларусаў: благаславенне, выпраўленне, выпечка каравая, дарэнне, выкуп у суборную суботу. Запрашэнне продкаў. Суборная субота (дзявочнік) – абрад развітання маладой са сваімі сяброўкамі, апошні вечар яе дзявоцтва напярэдадні вяселля. Хлапечнік. Вяселле ў хаце нявесты і жаніха. Асноўныя абрады галоўнай часткі вяселля: благаславенне, выпраўленне, абсыпанне (абсяванне) маладых, сустрэчы, звядзенне – абрад яднання маладых, выкуп, дарэнне. “Стаўбавы абрад” у хаце жаніха і ў хаце нявесты, яго рытуальныя значэнні. Абрад вянчання. Пасад маладых на дзяжу як самастойная частка ў складзе вясельнага абраду. Паслявясельная абраднасць беларусаў: благаславенне, камора – абрад першай шлюбнай ночы, завіванне (пакрыванне маладых, дарэнні, выпрабаванні для маладой, частаванне маладых пасля першай шлюбнай ночы кашай – вясельнай абрадавай ежай, пасаг, пярэзвы (перазоў, падвясёлкі, гасціна). Вясельная абрадавая ежа. Абрадавы каравай. Абрадавыя вясельныя касцюмы і тканіны, падарункі. Вясельныя сыны: сваты, свацця, дружка, дружок, дружына, каравайніцы, вячэрнікі, надкоснік, кубельнік, прыданыя. Запрашэнне вясельных чыноў. Святкаванне сярэбранага і залатога вяселляў, іншых этапаў сумеснага жыцця. Асаблівасць сучаснай вясельнай абраднасці беларусаў. Вясельная абрадавая паэзія, песні.

ТЭМА 4. ПАХАВАЛЬНА-ПАМІНАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ

